Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 88 (4921)
КРАСАВІК
23
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Імперыялісты Японіі арганізуюць антысовецкія правакацыі на Далёкім Усходзе. Рабочыя, сяляне, чырвонаармейцы! Умацуем абароназдольнасць нашай краіны! Няхай жыве наша Чырвоная армія на Далёкім Усходзе!

(З ПЕРШАМАЙСКІХ ЛОЗУНГАЎ ЦК ВКП(б)

АБ ПРАПРАЦОЎЦЫ РАШЭННЯЎ XVII З'ЕЗДА ПАРТЫІ

ПАСТАНОВА ЦК ВКП(б)

ЦК ВКП(б) устанаўляе, што ў некаторых краях і абласцях глыбокае вывучэнне рашэнняў XVII партз'езда падмяняецца паказной шумяхай і фармальным зазубрываннем паасобных палажэнняў. Сур'ёзная вучоба падмяняецца спартыўным азартам, арганізацыяй «палітбаёў», «палітаблаў», «палітвіктарын», «палітлатарэй», «палітвудачак», і т. п. Распаўсюджваюцца стандартныя пытанні для правядзення «палітбаёў», падчас абсалютна безграматныя, выпускаемыя «партгабінетамі», без прагляду і зацвярджэння культпропамі і парткомамі. Партыйцаў прывучаюць даваць шаблонныя адказы на загадзя распаўсюджваемыя шаблонныя пытанні, а культпропы, абавязаныя кантраляваць гэту справу, астаюцца ў баку.

Тым самым жывая большэвіцкая справа вывучэння рашэнняў XVII з'езда партыі апашляецца, ператвараецца ў мёртвую схаластыку, у беззмястоўную балбатню.

ЦК ВКП(б) пастанаўляе:

1. Прапанаваць партарганізацыі неадкладна ўстраніць адзначаныя вышэй скажэнні і адмяніць правядзенне «палітбаёў», «палітлатарэй», «палітвудачак» і т. п. форм прапаганды, якія не ўласцівы большэвізму.

2. Даручыць камісіі ў складзе тт. Жданава (старшыня), Стэцкага, Мехліса, Когана, Радыёнава, Кіллерога і Буліна ў 10-дзённы тэрмін, улічыўшы адбыўшыйся на пасяджэнні абмен думкамі, прад'явіць практычныя прапановы аб формах палітвучобы ў сувязі з прапрацоўкай рашэнняў XVII партз'езда, а таксама аб парадку правядзення партпалітмінімума для членаў партыі, кандыдатаў і спачуваючых, адпаведна іх узроўню развіцця і тэарэтычнай падрыхтоўкі.

ЦК ВКП(б).

АБ ХОДЗЕ ВЫВУЧЭННЯ РАШЭННЯЎ XVII З'ЕЗДА ВКП(б) І СТАНОВІШЧЫ РАБОТЫ СЕТКІ ПАРТАСВЕТЫ

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 21 красавіка 1934 г.

ЦК КП(б)Б канстатуе:

1. Што рад партарганізацый (Клічаў, Жлобін, Рэчыца, Лёзна, Талачын), не гледзячы на рашэнне Бюро ЦК КП(б)Б ад 11 сакавіка, яшчэ да гэтага часу не разгарнулі паглыбленай работы па вывучэнню рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) сярод комуністаў, комсамольцаў, беспартыйных рабочых і калгаснікаў. Сетка партасветы ў Клічаве, Талачыне, Жлобіне, Лёзне ў сувязі з наступленнем летнега перыяда амаль згарнула сваю работу. Школы і гурткі ў большасці распаліся.

2. Магілеўскі РК КП(б)Б не вынес урокаў з рашэння бюро ЦК КП(б)Б ад 11 сакавіка. Кіраўніцтва ходам прапаганды рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) ускладаў на інструктара РК—быўшага загадчыка культпропаддзелам.

3. У паасобных партарганізацыях (Крычаў, Бабруйск, Магілеў) паглыбленае вывучэнне рашэнняў з'езда падмяняецца фармальным зазубрываннем асобных пытанняў. Комуністаў, комсамольцаў, беспартыйных прывучаюць даваць шаблонныя адказы на загадзя распаўсюджваемыя шаблонныя пытанні па апытальніках.

4. Апраўдаўшая сябе форма вучобы—здача грамадска-палітычных залікаў у паасобных партарганізацыях бюракратычна рэгламентуецца зверху замест арганізацыі гэтай работы знізу на аснове мабілізацыі грамадскасці.

5. Мае месца зусім недапушчальная, прыніжаючая ўсё аграмаднае значэнне рашэнняў з'езда і даклада тав. Сталіна, практыка грашовага прэміравання (Сенненскі раён) за ўсваенне рашэнняў з'езда і даклада тав. Сталіна, вульгарызацыя метадаў прапрацоўкі рашэнняў з'езда—арганізацыя палітвудачак (Крычаўскі раён).

6. ЦК КП(б)Б адзначае, што яшчэ да гэтага часу ў радзе раёнаў (Жыткавічы, Талачын, Смалявічы) матэрыялы з'езда, у прыватнасці даклад т. СТАЛІНА І КАГАНОВІЧА, не даведзены да пярвічных партарганізацый і калгасаў.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

Прызнаць прапрацоўку рашэнняў з'езда партыі і прамовы т. Сталіна з боку РК—Клічаў, Жлобін, Рэчыца, Лёзна, Талачын—нездавальняючай.

За зусім нездавальняючую работу па прапагандзе рашэнняў з'езда, адсутнасць кіраўніцтва работай сеткі партасветы сакратарам Клічаўскага, Рэчыцкага, Талачынскага РК КП(б)Б паставіць на від.

Рашэнне пленума Магілеўскага РК КП(б)Б аб выдзяленні адказным за кіраўніцтва ходам прапаганды рашэнняў XVII з'езда па раёну—інструктара райкома быўшага загадчыка культпропаддзелам, як няверное, адмяніць.

Указаць сакратару Сенненскага РК тав. Ленцнеру, Крычаўскага РК т. Кулінковічу аб нерэгаванні на зусім недапушчальныя формы прапрацоўкі рашэнняў XVII з'езда.

Папярэдзіць усе партарганізацыі аб недапушчальнасці згортвання работы сеткі партасветы ў сувязі з наступленнем летняга перыяда.

Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б, палітаддзелам МТС і соўгасаў забяспечыць бесперабойную работу па партасвеце на працягу ўсяго летняга перыяда.

ЦК КП(б)Б падкрэслівае неабходнасць шырокага разгортвання ва ўсіх партарганізацыях здачы грамадска-палітычных залікаў, па сутнасці ўважліва правяраючы ўсваенне рашэнняў з'езда партыі, гэтым самым дапамагаючы членам і кандыдатам партыі найбольш паглыблена ўсвоіць рашэнні з'езда.

Прапанаваць ДВБ і БАКТ прыняць тэрміновыя меры да прасоўвання з'ездаўскай літаратуры непасрэдна да пярвічных партарганізацый і калгаснікаў.

Партвыдату паскорыць дадатковы выпуск даклада тав. Сталіна ў 30 тыс. экз., забяспечыўшы таксама выпуск яго прамовы на літоўскай мове.

Указаць тав. Верашу на зусім нездавальняючую работу па забеспячэнню з'ездаўскай літаратурай на яўрэйскай і польскай мовах.

Даручыць аддзелу культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б арганізаваць праверку выканання данага рашэння.

Да менскай гарадской канферэнцыі рабочых спажыўцоў

Нядаўна рэдакцыяй «Звязды» бы. Яны настойліва патрабуюць сумесна з Белкаапсаюзам і ЦП саюза работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю, пры ўдзеле рабочых-ударнікаў, быў праведзен рэйд па магазінах, базах і арцелях Менска. Рэйд з'явіўся адным з мерапрыемстваў у падрыхтоўцы да канферэнцыі спажыўцоў, пайшчыкаў і работнікаў прылаўка, якая сёння адкрываецца.

Матэрыялы рэйда былі надрукаваны ў «Звяздзе». Адначасова з гэтым быў надрукаваны **соцыялістычны рахунак рабочых горкаўскага аўтазавода швэйным і абутковым фабрыкам БССР.**

Як вынікі рэйда, так і рахунак горкаўцаў вельмі красамоўна гавораць, што работа гандлюючых арганізацый і прамысловых прадпрыемстваў Беларусі, вырабляючых тавары шырокага ўжытку, не задавальняе ўзросшых запатрабаванняў рабочых і калгаснікаў.

Кааператыўныя арганізацыі яшчэ не навучыліся культурна гандляваць. Яны, як і раней, замест правільнай арганізацыі совецкага гандлю займаюцца механічным размеркаваннем тавараў і зусім не вядуць барацьбы за асартымент, фасон і якасць.

Больш таго, у пагоні за процантамі і камісійнай узнагародай работнікі кааператыўнай і гандлёвай сістэмы закупляюць у розных частках Саюза тавары, якія можна набыць на мясцовым рынку, часамі горшай якасці, чым мясцовыя. Нярэдкі таксама выпадкі, калі купляюцца за межамі БССР тавары вырабу... беларускіх швэйных і абутковых фабрык. У гэтым асабліва праяўляюць сябе работнікі сістэмы Белкаапсаюза.

Нашы рабочыя хочуць мець добрую мэблю, прыгожыя прадметы хатняга ўжытку, хочуць насіць добра пашытыя польты, гарнітуры, бялізну і трыкатажныя вырабы. Яны настойліва патрабуюць прыгожага і моцнага абутку.

Ці здавальняе гэтыя патрабаванні наша гандлюючая сістэма? Не. На паліцах магазінаў, на базах, як гэта паказваюць матэрыялы рэйда, ёсць шмат розных тавараў. Але ўсё гэта, паводле вобразнага выразу горкаўскіх аўтазаводцаў, прад'яўляе сабой «скучный товар».

«...**Каму-ж**, — як гэта падкрэсліваюць у сваім рахунку горкаўскія аўтазаводаўцы—**патрэбен касцюм з надставачнымі бартамі, неаднолькавымі кішэнямі, без падкладкі і прытым касцюм вечна з аднолькавага грубашэрснага матэрыяла аднолькавага колера. Або, скажам, хто будзе купляць панчохі, джэмперы, світры і т. п. трыкатэжныя вырабы, якія прыходзяць у негодасць на другі-ж дзень».**

А ці толькі горкаўскія аўтазаводаўцы заяўляюць гэта? Кожны дзень можна пачуць ад любога напага рабочага падобныя заявы. Часта аб гэтым заяўляюць нават тыя, **хто непасрэдна вырабляе гэтыя нядобраякасныя тавары.**

У чым справа? Хто вінават у гэтым? Вінаваты ў першую чаргу гандлёвыя арганізацыі. Работнікі гандлёвай і кааператыўнай сістэмы, толькі яны вінаваты ў тым, што ў магазін трапляе «скучный» часамі зусім негодны тавар. Яны вінаваты ў тым, што ў магазінах вялікае «затаварванне», што ў нізходзіць тавары ўкладзены мільёны рублёў зваротных сродкаў.

Гандлёвыя арганізацыі не прымушаюць прамысловыя прадпрыемствы працаваць на спажыўца. Яны не дыктуюць прамысловасці асартымента, фасона, не сочаць за якасцю выпускаемай прадукцыі. А без гэтага, зразумела, спажывец не атрымае патрэбнага яму тавару.

Працоўныя спажыўцы Менска, якія сёння збіраюцца на гарадскую канферэнцыю, трэба думаць, прад'явяць свае патрабаванні да прамысловых і гандлюючых арганізацый. Яны следам за горкаўскімі аўтазаводаўцамі скажуць:

— Дайце нам такі тавар, такія касцюмы, польты, брукі, бацінкі, якія-б адпавядалі нашым патрабаванням. Інакш мы загадзя адмаўляемся ад іх.

Нашым абутнікам, швэйнікам сорамна выпускаць дрэнная якасці вырабы. Рабочыя, швэйных і абутковых фабрык БССР абавязаны аплаціць соцыялістычны рахунак горкаўцаў. Рабочым-ударнікам горкаўскага аўтазавода, якія вельмі хутка змаглі аўладаць складанай тэхнікай вырабу аўтамашын, мы павінны даць лепшай якасці, лепшага фасона і асартыменту тавары і тым самым зняць з сябе чорную пляму бракаробаў.

Работнікі гандлёвых арганізацый павінны прад'явіць рахунак нашай прамысловасці. Прамысловыя прадпрыемствы выпускаюць сваю прадукцыю не для склада, а для спажыўца. Спажывец-жа гэту прадукцыю атрымлівае праз гандлёвую сістэму. Гандлёвыя арганізацыі абавязаны патрабаваць ад прамысловасці такі тавар, які-б не залежваўся на паліцах і складах, а хутка знаходзіў спажыўца. Толькі пры такіх умовах па каналах баз, магазінаў, крам бесперапынна будуць пыркуляваць тавары ад месц вытворчасці да спажыўца, і спажывец знойдзе ў магазіне і краме, што яму патрэбна.

Гандлёва-кааператыўная сістэма абавязана павесці самую рашучую барацьбу за якасць, за асартымент, за фасон. Яна абавязана лозунг: **«Совецкі магазін бракам не гандлюе»** ператварыць у дзейсную зброю за разгортванне совецкага гандлю, за ўсебаковае і поўнае задавальненне ўзросшых патрабаванняў працоўнага спажыўца.

ЗАДАННЕ ПАРТЫІ і УРАДА НЕ ВЫКАНАНА АВЕС ЗАСЕЯН ТОЛЬКІ НА 38,6 проц. ПЛАНА

Пад сцягам соцыялістычнага спаборніцтва высокаякасна выканаем план сяўбы зернавых і Ільну да 1 мая

Засеяна 417.548 гектараў

План сяўбы аўса выканан толькі на 38,6 проц.

НА 20 КРАСАВІКА ПА БССР ЗАСЕЯНА 417.548 ГЕКТАРАЎ—16,7 ПРОЦ. ПЛАНА.

ПА СОЎГАСАХ ЗАСЕЯНА 24.554 ГЕКТАРЫ—10,7 ПРОЦ.; ПА КАЛГАСАХ—290.713 ГЕКТАРАЎ—21,2 ПРОЦ.; АДНААСОБНІКІ — ЗАСЕЯЛІ 100.012—10,2 ПРОЦ.

ЗЕРНАВЫХ ЗАСЕЯНА 347.384 ГЕКТАРЫ (27,4 ПРОЦ.), У ТЫМ ЛІКУ АЎСА—204.767 ГЕКТАРАЎ (38,6 ПРОЦ.), ПШАНІЦЫ—38.265 ГЕКТАРАЎ (27,5 ПРОЦ.).

БУЛЬБЫ ЗАСЕЯНА 25.161 ГЕКТАР (4,1 ПРОЦ.), А ІЛЬНУ—27.528 ГЕКТАРАЎ (11,1 ПРОЦ).

Зрыўшчыкі сяўбы

Дырэктарам соўгасаў „ПАБЕДА" (Мсціслаўе), „РАВАНІЧЫ" (Чэрвень), ДАЎГАЛЕССЕ (Гомель), ЗАМОШША (Слуцк), БОРКАВІЧЫ (Дрыса), „КОМУНАР" (Уваравічы)

На 20 красавіка ў вас яшчэ зусім не пачалі сеяць. Гэта сведчыць аб вашых безадказных адносінах да правядзення такой важнейшай справы, як яравая сяўба.

Патрабую прыняцця рашучых мер, да правядзення сяўбы ў тэрміны, вызначаныя ўрадам. Паведамце Соўнаркому, што вы канкрэтна прымаеце да ліквідацыі гашага прарыву.

Старшыня Соўнаркома ГАЛАДЗЕД.

Старшыням Асвейскага, Суражскага, Талачынскага, Мсціслаўскага, Шклоўскага, Плешчаніцкага, Капыльскага, Крупскага, Чэрвеньскага і Чэрыкаўскага райвыканкомаў

План сяўбы ў вашых раёнах на 20 красавіка выканан не больш 1 проц. (Крупскі—0,1 проц., Чэрыкаў—1 проц.). Аднаасобнікі зусім не падрыхтаваны да сяўбы і не разгортваюць работы. Гэта сведчыць аб тым, што вы не змагаецеся за большэвіцкія тэмпы сяўбы, ганебна зрываеце сяўбу.

Патрабую мабілізацыі ўсіх сіл для разгортвання сяўбы ва ўсіх сектарах і сканчэння ў тэрміны, вызначаныя ўрадам. Аб ходзе сяўбы інфармуйце СНК кожныя пяць дзён.

Старшыня Соўнаркома ГАЛАДЗЕД.

Спаборніцтва паміж БССР і Заходняй вобласцю

ХОД СЯЎБЫ ПА БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ ПА 20 КРАСАВІКА

ЗАСЕЯНА	БССР	Заходн. вобл.
Усіх культур	417.548 гект. 16,7 проц.	166.924 гект. 5,1 проц.
У ТЫМ ЛІКУ:		
Соўгасамі	10,7 „	2,6 „
Калгасамі	21,2 „	6,8 „
Аднаасобнікамі	10,2 „	1,4 „
У ТЫМ ЛІКУ:		
Аўса	38,6 „	7,2 „
Ільну	11,1 „	1,9 „
Бульбы	4,1 „	0,2 „

Лепшыя калгаснікі-ўдарнікі едуць на першамайскія святы ў Ленінград

РАГАЧОЎ, 22. На 20 красавіка калгасамі МТС засеяна 3.281 гектар зернавых, што складае 80,5 проц. плана. План сяўбы аўса выканан на 84,2 проц., ячменю на 97,8 проц. Звыш 25 буйнейшых калгасаў закончылі сяўбу зернавых і абавязаліся да 1 мая поўнасцю закончыць сяўбу.

Якасць сяўбы ў гэтым годзе значна вышэйшая, чым у мінулым. Амаль ва ўсіх калгасах працуюць інспекцыі якасці, якія прымаюць работу.

Па запрашэнню ленінградскіх рабочых палітаддзел накіроўвае ў Ленінград на першамайскія святы лепшых калгаснікаў-ударнікаў з калгасаў ІМЯ СТАЛІНА, «ЧЫРВОНЫЯ БАЛКІ», «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ», ІМЯ МОЛАТАВА, «ІСКРА» і «ЗВЯЗДА», якія датэрмінова і добраякасна закончылі сяўбу.

Сенненшчына канчае сяўбу ільну

СЯННО, 21. ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЯ СЕННЕШЧЫНА ПАДЫХОДЗІЦЬ ДА СКАНЧЭННЯ СЯЎБЫ ІЛЬНУ — ВЯДУЧАЙ КУЛЬТУРЫ РАЁНА. БОЛЬШЭВІЦКІЯ ТЭМПЫ СЯЎБЫ ЦЕСНА СПАЛУЧАЮЦЦА З ВЫСОКАЙ ЯКАСЦЮ РАБОТ. КОЖНЫ ЗАСЯВАЕМЫ ГЕКТАР ПРЫМАЕЦЦА БРЫГАДЗІРАМ РАЗАМ З КАМІСІЯЙ ЯКАСЦІ.

ПА 20 КРАСАВІКА ПА РАЁНУ ЗАСЕЯНА 6.627 ГЕКТАРАЎ ІЛЬНУ—96 ПРОЦ. ПЛАНА. СЕЛЬСОВЕТЫ ЛАТЫГАЛЬСКІ, УЛЬЯНАЎСКІ І СЕННЕНСКІ ПЕРШЫМІ ЗАКОНЧЫЛІ СЯЎБУ ІЛЬНУ І ЗАРАЗ ПРАВОДЗЯЦЬ ЗВЫШПЛАНАВЫ ПАСЕЎ. КАЛГАСАМІ ЛАТЫГАЛЬСКАГА СЕЛЬСОВЕТА ЗАСЕЯНА ЗВЫШ ПЛАНА 9,5 ГЕКТАРА, УЛЬЯНАЎСКАГА —11. УСЯГО ЗАКОНЧЫЛІ СЯЎБУ ІЛЬНУ 108 КАЛГАСАЎ РАЁНА.

20 І 21 КРАСАВІКА ПРАВОДЗІЛАСЯ КАЛГАСНАЯ ЎЗАЕМАПРАВЕРКА ЯКАСЦІ ПАЛЯВЫХ РАБОТ. 22 КРАСАВІКА—РАЁННАЯ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА З ДАКЛАДАМІ ЎЗАЕМАПРАВЕРАЧНЫХ БРЫГАД 12 КАЛГАСАЎ АБ ВЫНІКАХ ЎЗАЕМАПРАВЕРКІ.

Большэвіцкая МТС скончыла сяўбу аўса

Калгасы дзейнасці Большэвіцкай МТС на 20 красавіка выканалі план сяўбы аўса на 102,8 проц. засеялі 1351 га, план 1310 га, пшаніцы — 40,8 проц., ячменю — 44 проц., ільну — 17,5 проц.

Перад калгасамі пастаўлена задача высокаякасна закончыць поўнасцю і да 1 мая сяўбу ўсіх раннім зернавых, ільну, бульбы.

Нам. начпалітаддзела Большэвіцкай МТС ПАЛЯКОЎ.

***

ЛЕЛЬЧЫЦЫ

КАЛГАСЫ ЛЕЛЬЧЫЦКАЙ МТС НА 20 КРАСАВІКА ВЫКАНАЛІ ПЛАН СЯЎБЫ РАННІХ ЗЕРНАВЫХ. АЎСА ЗАСЕЯНА 692 ГЕКТАРЫ (103 ПРОЦ.), ПШАНІЦЫ — 8 ГЕКТАР (108 ПРОЦ.), ЯЧМЕНЮ—20 ГЕКТАРАЎ—(100 ПРОЦ.).

ЖДАНОВІЧ.

ЧАШНІКІ

26 калгасаў зоны дзейнасці ЧАШНІЦКАЙ МТС 20 красавіка выканалі план сяўбы аўса. Сяўба праведзена добраякасна і прынята інспекцыяй якасці. Узорныя прыклады высокай якасці работы паказалі калгасы «КАСТРЫЧНІК», «Х КАСТРЫЧНІК» ІМЯ ПАЛІТАДДЗЕЛА, якія скончылі сяўбу аўса 18 красавіка.

Начальнік палітаддзела НІКІЦІН.

ДРЫСА

Калгасы раёна разгарнулі масавую сяўбу толькі ў пачатку чацвертай пяцідзесяўкі красавіка. 22 калгасы поўнасцю закончылі сяўбу аўса. Разгортваецца масавая сяўба ільну.

Калектыўны карэспандэнт «Звязды»—рэдакцыя раённай газеты.

Соўгасы БССР засеялі толькі 32,2 проц. аўса

Па трэстах сістэмы Ўпоўнаркома соўгасаў на 20 красавіка ўсяго засеяна 11.444 гектара або 1[illegible] проц. плана, у тым ліку аўса 7.834 гектары або 32,2 проц. плана.

Менскі малочна - прамысловы трэст выканаў план сяўбы яравых на 15,8 проц., віцебскі трэст на 4,6 проц. плана, гомельскі — 24,3, штушкатрусагадоўчы трэст на 20 проц., менскі свінаводчы трэст — 17,7 проц., аршанскі — [illegible] проц., магілеўскі — 8,7 проц., племтрэст — 20,8 проц. плана.

У Крычаве гатунковы авёс сеюць у апошнюю чаргу

КРЫЧАЎ. (Кар. «Звязды»).

Старадынаў Пятро — вопытны і гаспадарлівы старшыня. У яго калгасе «Новае жыццё», Маляціцкага сельсовета, вага працадня за 1933 год найбольшая па раёну: 4 кілограмы зернавых і 8 кілограмаў бульбы. Ураджайнасць летась у калгасе была высокая. Чаму?

— Зернавыя — авёс, ячмень, — былі засеяны рана, — тлумачыць Старадынаў.

— А сёлета не сеяце зараней гатунковага аўса?

— Мароз... баімся. Ніхто нічога не кажа з раёна...

Устанавілася ўжо цёплае, ціхае, сонечнае надвор'е, але ў калгасах Крычаўшчыны ўсё яшчэ «марозныя» настроі. Сяўба гатунковага аўса, які патрабуе ранняга высеву, з дня на дзень адкладваецца. На 15 красавіка па раёну засеяна ўсяго толькі 120 гектараў. На бліжэйшую пяцідзеўку калгасы ў першую чаргу намецілі сеяць ячмень, пшаніцу, толькі не авёс.

— Авёс на працадні дзяліць не будзем, так што паспеем, — разважаюць ва многіх калгасах кіраўнікі, падпаўшыя пад уплыў кулацкіх настроеў.

Гэтым кулацкім настроям ніхто адпору не дае.

М. ВІШНЕЎСКІ.

ФОТААББІНАВАЧВАННЕ



15 красавіка 4 «фардзоны» Сіроцінскай МТС вышлі арацъ, але ўзаралі за адзін дзень толькі 2,75 гектары. Трактарыст Стральцоў згубіў пемеш.

На здымку: прастой на полі.

Сеюць непратручаным насеннем

Фармалін ляжыць на складах

(Ад палескага карэспандэнта «Звязды»)

Масавая сяўба ў калгасах Даманавіцкай МТС у разгары. Рад калгасаў ужо скончылі сяўбу ранніх яравых — аўса, пшаніцы, і ячменю. (Калгасы «Чырвоная зорка», «Новыя Даманавічы», «Чырвоная перамога», «Рухавік рэвалюцыі» і інш.). Гэтыя калгасы з'яўляюцца перадавікамі. Яны сеялі з захаваннем аграправіл, далі высокую якасць палявых работ. Канчаюць сяўбу і іншыя калгасы Мазырскага раёна.

АЛЕ РАД КАЛГАСАЎ ПАРУШАЮЦЬ САМЫЯ ЭЛЕМЕНТАРНЫЯ ПРАВІЛЫ, СЕЮЦЬ НЕПРАТРУЧАНЫМ НАСЕННЕМ. Атрыманы фармалін ляжыць на складах.

Даманавіцкая МТС абслугоўвае 66 калгасаў, з якіх 28 яшчэ не атрымалі фармаліну і сеюць непратручаным насеннем. Гэта калгасы Даманавіцкага, Ліпаўскага, Дудзіцкага, Сухавіцкага, Хаміцкага і Зеленоцкага сельсоветаў.

— Хіба мы вінаваты, што калгасы не атрымліваюць фармалін? Мы ім паведамілі, — апраўдваецца дырэктар МТС Кунцэвіч.

Атрыманы фармалін МТС аддала краме «Белгандлю» для раздачы калгасам. Але крама заўсёды на замку. Калгасныя падводы, якія прыходзяць за фармалінам, пустымі вяртаюцца назад.

10 красавіка калгасы «Новае Запоплье», «Чырвоная Дуброва», «Совецкая Беларусь», якія знаходзяцца на адлегласці 18-20 кілометраў, прыслалі падводы за фармалінам і, не знайшоўшы загадчыка крамы Белгандлю Савіцкага, вярнуліся да дому без фармаліну.

Дырэктар МТС Кунцэвіч ведаў аб гэтым і не прыняў ніякіх мер, каб расшукаць Савіцкага. 8 красавіка калгас «Новае Заполле» таксама прысылаў падводу за фармалінам. Крама якраз была адкрыта. Але ў падводчыка не было 5-ці рублёў, каб заплаціць за фармалін. Савіцкі без грошай фармаліну не выдаў. Ён строга выконваў распараджэнне дырэктара МТС Кунцэвіча — без грошай не выдаваць фармаліну.

Дырэктар Даманавіцкай МТС Кунцэвіч свядома зрывае дырэктывы партыі і ўрада аб ураджайнасці, аб агратэхніцы, аб пратручванні насення.

Вл. МАЧАЛЬСКІ.

РОСТ ПАГАЛОУЯ—У РУКАХ БРЫГАДЫ

Стварыць пастаянную жывёлагадоўчую брыгаду, укараніць індывідуальную здзельшчыну на калгаснай ферме

Наладзім пастаянны абмен вопытам

АДКАЗ ДУНІ ТКАЧ НА ПІСЬМО НІНЫ ВАСІНАЙ

Дарагі таварыш Васіна!

Мы атрымалі тваё пісьмо. Усё, што напісала ты пра нашу брыгаду, на вялікі жаль, усё праўда. Прыходзіцца прызнацца.

Ты пішаш, што ў вас брыгада працуе дружна, што вы зжылі прагулы, што ў вас дысцыпліна высокая. Якраз гэтага ў нас няма. Мы дагэтуль мелі шмат фактаў спазнення на работу, шмат выпадкаў прагулаў. Вось, напрыклад ВЕЧАР ЛІДА сістэматычна рабіла прагулы. КУРЫЛОВІЧ ЮБА сістэматычна зрывала работу брыгады. Якой-жа можна чакаць добрасумленнай, дружнай работы брыгады пры такіх умовах. Якой-жа можна чакаць добрасумленнай дружнай работы ад лодыраў, гультаёў і прагульшчыкаў. А мы замест таго, каб ачысціць нашы рады ад гэтых лодыраў і прагульшчыкаў, працоўнай дысцыпліны, цацкаліся з імі і такім чынам самі развальвалі работу брыгады.

Вы здолелі дабіцца добрага жыцця для свіней. Ты пішаш, што ў вас у свінарніку не горш, чым у добрым калгасным памяшканні. А мы яшчэ да гэтага часу адносімся да свіней па-свінску. У свінарніках у нас грязь, холод, станкі несвоечасова чысцяцца.

Ты, тав. Васіна, пішаш, што адносишся сябе адзіначальнікам у сваёй брыгадзе, што ты сама падаравала сабе брыгаду з лепшых работніц-ударніц соўгаса, якія добрасумленна працуюць зараз з табой у тваёй брыгадзе. Я хоць і працую ўжо больш за год брыгадзірам, але гэтым не захваліцца не магу, відаць, таму, што ўсё яшчэ дрэнна кірую я брыгадай.

У нас таксама, як і ў вас, аплата праводзіцца па выніках працы. Але нас дрэнна тое, што мы яшчэ добра не ўсвядомілі метадаў аплаты. У выніку ў нас людзі ў брыгадзе часта мяняюцца, а што датычыць соцыялістычных метадаў працы, то і гаварыць няма чаго. Праўда, калісці мы заключылі дагавор на соцспаборніцтва з нейкай брыгадай, але вось колькі часу прайшло, а выканне гэтага дагавора ніхто не праверыў. Вы самі ведаеце, якая карысць ад спаборніцтва, калі яно не правяраецца на практычнай рабоце.

Розныя метады працы, розныя адносіны да догляду свіней далі розныя вынікі. У вас адыход маладняка ад апаросу гэтага года складае 1 процант, а ў нашай брыгадзе знішчана 30 процантаў.

Хто-ж пасля гэтага можа пярэчыць, што справа не ў нас саміх, хто адмовіць, што ад нас залежыць захаванне маладняка?

Доўга пісаць няма чаго. Справа ясная. Нам трэба пераняць ваш вопыт работы, каб змыць з сябе ганебную пляму адставання.

Матка з 12 парасятамі брыгады ГРЫХУЦІКА (соўгас «Блонь»).

Мы можам і павінны захаваць увесь апарос.

Мы ў першую чаргу павінны вызваліцца ад прагульшчыкаў, лодыраў, ад тых, хто нядбайна адносіцца да работы. Мы парашылі выгнаць з нашай брыгады прагульшчыцу ВЕЧАР, сурова папярэджваем КУРЫЛОВІЧ, што калі яна не паправіцца, мы яе прагонім з фермы, як ворага нашай свінагадоўлі.

Мы абавязваемся ўстанавіць такі парадак на свінарніку, такую чыстату, якія існуюць у вас.

Мы просім нашу адміністрацыю дапамагчы наладзіць чыстату каля свінарніка, забяспечыць вапнай і апілкамі.

Адначасова мы патрабуем ад адміністрацыі наладзіць ветэрынарнае абслугоўванне свінарнікаў. Нецярпімым з'яўляецца такое становішча, калі ўжо доўгі час няма ветэрынарнага доктара для абслугоўвання фермы. Дый зоатэхнік наш не дае нам належнай дапамогі.

Запэўняем цябе, тав. Васіна, і тваю брыгаду, што мы прымем усе захады, каб поўнасцю знішчыць адыход маладняка і не толькі ў нашай брыгадзе. Мы разгорнем спаборніцтва — сапраўднае, баявое з усімі нашымі брыгадамі на тое, каб дабіцца яшчэ лепшых вынікаў, чым тыя, якія вы маеце зараз.

Мы вельмі просім цябе, тав. Васіна, прыехаць да нас. Сама ўпэўнішся, што мы гэтыя словы ператворым у баявую справу. Мы ўпэўнены ў перамозе. Але глядзі, тав. Васіна, сама не падкачай. Супольнымі сіламі даб'емся лепшых вынікаў у агульнай рабоце па выкананню ўказанняў нашага правадыра тав. СТАЛІНА аб разгортванні жывёлагадоўлі.

ТКАЧ ДУНЯ.
Брыгадзір 5-й брыгады соўгаса Івань.

ЗЛОСНЫЯ ЗНІШЧАЛЬНІКІ ЖЫВЁЛЫ—ПЕРАД ПРОЛЕТАРСКІМ СУДОМ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта „Звязды")

ДУБРОЎНА, 18. Трэці дзень у перапоўненым зале клуба фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» адбываюцца пасяджэнні выязной сесіі Вярхоўнага суда БССР па справе віноватых у масавым знішчэнні жывёлы ў Дубровенскім раёне.

Сесію ўзначальвае старшыня тав. **Чубкова.** Члены суда—тт. **Шахоркін** і **Рабцаў**, абвінавачванне падтрымлівае памочнік пракурора рэспублікі т. **Шыфрын**, абараняюць падсудных тт. **Мазе** і **Дайлідовіч.**

Працэс выклікаў вялікае абурэнне працоўных супроць хабарнікаў, кулакоў і спекулянтаў. На ім перабывалі сотні рабочых, служачых, калгаснікаў. Як вядома з сігналаў ЦО партыі «Правды» ў Дубровеншчыне на працягу 1933 і пачатку 1934 гадоў злачынна разбазаравалі буйную рагатую жывёлу і свіное пагалоўе. За 5 месяцаў мінулага года на раёну знішчана 18.510 галоў жывёлы. З простага папушчэння былога раённага кіраўніцтва (сакратар РК КП(б)Б **Кацман**, старшыня РВК **Сямашка**), група класавых ворагаў сістэматычна праводзіла тут сваю шкодніцкую дзейнасць. На лаве падсудных—15 чалавек. 10 з іх знаходзяцца пад вартай. Па справе выклікана звыш 50 сведак.

«Герояў» дубровенскай справы можна разбіць на чатыры групы.

Перш за ўсё гэта—кампанія злосных хабарнікаў—ветэрынарных работнікаў: загадчык лядзянскага ветпункта **Шкрабнёў**, фельчар таго-ж пункта **Лестнікаў**, раённы ветінспектар **Гаўрыльчык.** Далей ідуць кулакі і ліцэнцы з ліку дубровенскіх жывёлаводаў і паасобныя старшыні калгасаў (**Салінкоў, Якімаў, Пік, Драбышэўскі, Васілёнка**).

Характэрна група спекулянтаў-загатоўшчыкаў, упартых парушальнікаў канвенцыйных цэн на буйную рагатую жывёлу—браты **Фелеры, Бупах, Печнікаў, Новікаў.** Нарэшце, перад судом райветдоктар **Гутараў** і загадчык райза **Галубчыкаў**, якія, даючы дазволы на зарэз зусім здаровых кароў і цялят, спрыялі дрэнежніцкаму знішчэнню пагалоўя.

Цэнтральныя фігуры на працэсе—ветработнікі Шкрабнёў і Лестнікаў. Хто такі Шкрабнёў? Бацькі яго ў недалёкім мінулым—гандляры. У 1930-31 годзе гаспадарка Шкрабнёвых абкладалася, як кулацкая, цвёрдым заданнем. Свой соцыяльны твар Шкрабнёў старанна ўтойвае.

Шкрабнёву належыць «ідэя» браць за кожны дазвол на забой жывёлы па 25-50 рублёў, як залог за скуру (?). Фактычна гэта—шырма для хабару.

—Скажэце, грамадзянін Шкрабнёў,—пытае пракурор,—вы давалі распіскі сялянам у атрыманні ад іх гэтых «залогаў»?

— Не, не даваў...

— Чаму-ж?..

— А так, ведаеце, я крыху хворы... У мяне з дзяцінства галава набальвае... Зноў-жа я—нервовы...

— А грошы пасля здачы скуры вярталі грамадзянам?

— Не было чаго вяртаць... Грошы я сам выдаткоўваў на сябе...

Так засталіся «на ўспамін» Шкрабнёву «залогі» ад адпаасобнікаў Наумава, Чарткова, Кузлункова...

Бліжэйшы памочнік Шкрабнёва—Лестнікаў—устанавіў своеасаблівую «таксу» за кожны дазвол на забой здаровай жывёлы: 50 рублёў. Грошы цяклі ў яго кішэню таксама пад выглядам залога за скуру, якую павінен уласнік жывёлы здаць потым дзяржаве.

— Некаторым грамадзянам я ўсё-ж вяртаў гэтыя грошы,—прабуе апраўдацца ветфельшар Лестнікаў—вярнуў, напрыклад, селяніну Волкаву.

— А цікава, вы ведаеце, дзе цяпер Волкаў,—пытае тав. Шыфрын.

— Ён памёр...

Ну, ясна—на нябожчыка ўсё можна валіць. Вытрымае...

Далей высвятляецца, што Лестнікаў не грэбваў ні гарэлкай, ні мясам, ні салам. Усякае лыка ішло ў страку—і дазволы на забой, на дрэнежніцкае разбазарванне стада выдаваліся пачкамі. Ад гэтых удалых ветэрынараў не адставала і іх непасрэднае начальства — ветінспектар раёна **Гаўрыльчык.** Ён таксама сістэматычна браў хабар за выдачу дазволаў (між іншым, гандляваў адначасова крышталічным ідам з лячэбніцы), пакрываў злачынствы на лядзянскім ветпункце, сам браў і грашыма, і «натурай»...

Так, намаганнямі гэтых кулацкіх агентаў лядзянскі ветпункт ператварыўся ў кантору па выдачы даведак на права забою жывёлы.

З допыту сведкі Велікоўскага (па гэтай групе абвінавачаных) высветлілася, што ў м. Лядах масаваму знішчэнню жывёлы дапамог у сваю чаргу мясцовы камітэт узаемадапамогі. Ён адкрыў спецыяльна «кашэрную» бойню ў Лядах, запрасіўшы, як майстар, старога клерыкальнага рэзніка. І атрымаўся надзел працы: на «трэф» давалі санкцыю Шкрабнёвы, Лестнікавы, Гаўрыльчыкі; на «кошэр»—камітэт узаемадапамогі на чале са старшынёю комсамольцам Велікоўскім.

Зусім відавочна, да чаго прывяла, нарэшце, гэта «спаранная» плённая дзейнасць...

ЮР. ЛЯВОННЫ.

З ДАЗВОЛУ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

(АД ПАЛЕСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ»)

Касцюковіцкая і дубровенская справы не паслужылі ўрокам для мазырскіх земельных арганізацый, а таксама для райкома партыі. Не паслужылі ўрокам і сігналы «Звязды» аб масавым знішчэнні жывёлы ў Мазырскім раёне. Рашэнні партыі аб гэтых двух раёнах і аб гадоўлі маладняка да мас калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў не даведзены. Яны ляжаць пад сукном у райкоме партыі і райвыканкоме.

Райземаддзел (загадчык **Буянаў**) і жывёлагадоўчае аб'яднанне (загадчык **Казлоў**) дапамагаюць кулацкім элементам у забойстве маладняка.

План кантрактацыі цялят, атрыманы з Наркамзема, намеснік загадчыка райземаддзела **Рахуба** (член партыі) і зоатэхнік **Адрамовіч** схавалі і нікому аб ім нічога не сказалі. Такі-ж план быў даслан Наркамземам і жывёлагадоўчаму аб'яднанню. Але і там сустрэў яго тойжа лёс. Такім чынам план кантрактацыі цялят да калгасаў не даведзен.

Цялят рэжуць у масавым маштабе, галоўным чынам адпаасобнікі і калгаснікі як для асабістага карыстання, так і на рынак.

За пяць кілометраў ад Мазыра, у Бабрынецкім сельсавеце знаходзіцца калгас **«Чырвоная Беларусь».** Не гледзячы на тое, што калгас існуе 2 гады, аграмаджанага стада ён не мае. У калгасе 35 гаспадарак. Ацяліласа 20 кароў, і ўсе цяляты пайшлі пад нож. Старшыня калгаса член партыі **Бобр** першым зарэзаў сваё цялё. Яго прыкладу паследаваў член праўлення брыгадзір **Процька Васіль**, а за імі—і астатнія калгаснікі. Бобр на сходзе калгаснікаў заявіў:

— Я гадаваць цялё не хацеў і зарэзаў. Няхай гадуе сама дзяржава.

Калгаснікі Халмянскага сельсавета зарэзалі 16 цялят, адпаасобнікі 15. Гэта складае 50 проц. сёлетняга ацёлу. У калгасе **«Беларуская вёска»**, Даманавіцкага сельсавета калгаснікі **Гарбун Апанас, Чарняцоў Васіль, Чарняцоў Якаў** і другія парэзалі сваіх цялят з ведама праўлення калгаса. Усе адпаасобнікі, якія жывуць на хутарах гэтага сельсавета, знішчаюць цялят. Такіх прыкладаў многа. А сельсавет не прымае ніякіх мер.

Масавы забой цялят назіраецца ў Бабрынецкім, Баброўскім, Бярозаўскім, Слабодскім, Крышацкім і Ліпаўскім сельсаветах.

Кожную нядзелю ў Мазыры базарны дзень. Амаль на кожным возе прадаецца свежая цялячына. Перапоўнены мясам ларкі прыватнікаў. У кожны базарны дзень прадаецца каля сотні зарэзаных цялят.

Каля базара знаходзіцца ветэрынарная лячэбніца. Яшчэ на світані каля яе выцягваецца доўгая чарга. Лячыць жывёлу? За лякарствам? За парадамі да доктара? Нічога падобнага. Кляйміць цяляціну і ялавічыну для продажу.

— Як нахлынуць у базарны дзень, дык перапынку няма, няма часу другой работай займацца. Зранку да вечара прыходзіцца кляйміць, — заяўляе ветэрынарны доктар **Сідарэнка.**

І сапраўды. Аднаму чалавеку акляймець мяса 50-60 цялят ды 10-15 кароў—нагрузка празмерная. За адзін толькі сакавік лячэбніца пракляйміла мяса 160 цялят і 50 кароў.

А такіх лячэбніц, дзе кляймяць мяса, у Мазырскім раёне чатыры. Ды яшчэ бойня дапамагае. Адным словам, ветэрынарным работнікам хапае работы. Няма калі бываць у калгасах, лячыць жывёлу, наладзіць догляд і гадоўлю маладняка, трэба кляйміць мяса.

Масавае знішчэнне цялят ідзе і ў **малочна-таварных фермах.** Толькі за 15 дзён сакавіка загінула і зарэзана 66 цялят. У калгасе «1-га мая» ацялілася 15 кароў, і ўсе цяляты знішчаны. У калгасе «Чырвоная змена», Крышацкага сельсавета, з шасці цялят загінула чацвёра, у калгасе «Комінтэрн» гэтага-ж сельсавета знішчана таксама чацвёра цялят.

Ул. МАЧАЛЬСКІ.

АГЛЯД ДРУКУ

АБ ПАСТАЯННАЙ БРЫГАДЗЕ І АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ НА ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ ФЕРМАХ

На пастанову XVII з'езда ВКП(б) аб жывёлагадоўлі газета **«Ударнік Дзяржыншчыны»** адгукнулася адразу. Яна пачала мабілізоўваць шырокія калгасныя масы на барацьбу за захаванне ацёлаў і апаросаў, за аднаўленне пагалоўя.

Але гэтым газета абмежавацца не захацела. Яна пачала шукаць прычыну, асноўных віноватых валікага падзяжа парасят і цялят на жывёлагадоўчых фермах.

У перадавым артыкуле **«За сталую жывёлагадоўчую брыгаду»** газета расказвае:

«Возьмем для прыкладу вялікую жывёлагадоўчую ферму калгаса **«Чырвоны партызан».** На працягу аднаго толькі года на гэтай ферме змяніліся 4 загадчыкі і 12 свінарак. Аплата працы калгаснікаў тут вытвараецца выключна паводле колькасці даглядаемай жывёлы. Або возьмем малочна-таварную ферму калгаса **«Іскра».** Загадчык гэтай фермы Хмялеўскі так «зацікаўлен» у развіцці стада, што нават не ведае сёлетняга плана фермы».

Газета правільна ўзнімае пытанне пастаянства складу жывёлагадоўчай брыгады як умову захавання пагалоўя. Адной з важнейшых прычын вялікага адыходу маладняка, нізкіх удояў і дрэннай упітанасці жывёлы з'яўляецца амаль поўная адсутнасць правільнай арганізацыі працы ў жывёлагадоўлі.

Усебеларуская вытворчая нарада калгасных брыгадзіраў завастрыла ўвагу ўсіх калгаснікаў на тым, што брыгадзір у сваёй брыгадзе з'яўляецца адзіначальнікам. Роля брыгадзіра вытворчай брыгады імем на таму частолькі вырасла, што брыгада мае сталы склад калгаснікаў, матэрыяльна зацікаўленых у правільнай арганізацыі працы для дасягнення лепшых рэзультатаў. Паляводчая брыгада мае пастаянны склад калгаснікаў, замацаваны за ёю ўчастак зямлі, коняй, інвентар, збрую. Калі брыгада даб'ецца высокага ўраджаю, яна атрымлівае 15-20 проц. надбаўкі да працадзён.

Гэтага якраз няма ў жывёлагадоўлі. **Няма самага галоўнага — пастаяннай жывёлагадоўчай брыгады,** г. зн. правільнай арганізацыі працы і яе аплаты.

Іменна ў гэтым газета павінна шукаць адну з галоўных прычын вялікага падзяжа маладняка на фермах.

***

Пустой балбатнёй аб жывёлагадоўлі абмяжоўваецца газета **«Ленінская перамога»** — орган Парыцкага РК і РВК. Тут да гэтага пытання ўсё яшчэ падыходзяць спетайку, боязна, нечага чакаюць, аглядаюцца, усё яшчэ «заклінаюць» райземаддзел заняцца гэтай справай.

А што мы маем на фермах раёна?

Возьмем ферму калгаса **«Чырвоная Бярэзіна»**, Казлоўскага сельсавета, адну з лепшых малочна-таварных ферм раёна.

«У рабоце жывёлагадоўчай брыгады здзельнай аплаты працы няма. Даглядчыкі даглядаюць па 30 штук і кожнае незалежна ад якасці работы атрымоўвае па 20 працадзён у месяц. Не аплачваюцца здзельна і даглядчыцы маладняка. Такім чынам, не стымулюецца матэрыяльная зацікаўленасць даглядчыкаў у прыросце жывёлы і ў павелічэнні ўдою».

Такое-ж становішча і ў калгасе імя **Чарвякова**, Ламавіцкага сельсавета, у калгасе **«Чырвонае Дуброва»**, **«Пабядзіцель»**, імя **Молатава** і радзе іншых. **Ні брыгады, ні брыгадзіра, ні здзельнай аплаты працы на фермах няма.**

31 сакавіка газета друкуе пісьмо калгаса **«Чырвоная зорка»** па пытанню жывёлагадоўлі. Над гэтым лістом ідзе на ўсе пяць калон шапка пад лозунгам «выкарчаваць з калгасных ферм абязлічку і кулацкую ўраўнілаўку». «Кожнай ферме — сталую жывёлагадоўчую брыгаду». Тут-жа газета перадрукоўвае перадавы артыкул з **«Правды»**, дзе пастаянная брыгада разглядаецца як рашаючая ўмова ўздыму калгаснай жывёлагадоўлі.

Але дарэмна вы будзеце шукаць у лісце перадавога калгаса хоць адно слова пра брыгадзіра, пра пастаянны склад калгаснай брыгады для абслугоўвання жывёлы. Аб гэтым газета забыла.

Ці выпадкова гэта?

Не. Пад гучнымі лозунгамі ўсё яшчэ хаваецца балбатня і пустазвонства. Людзі крычаць аб масавым знішчэнні жывёлы, аб пакаранні вінаватых. Але яны не хочуць спусціцца ўніз, на калгасную ферму, пацікавіцца як на гэтай ферме працуюць, што там робіцца, як арганізавана праца. Газета не паказвае на практыцы калгаснікам, што вырашыць праблему жывёлагадоўлі мы зможам толькі тады, калі арганізуем працу ў жывёлагадоўчай брыгадзе па таму самаму метаду, як і ў паляводчай.

Прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук **акад. П. ГОРЫН**

Да вынікаў красавіцкай сесіі Беларускай Акадэміі навук

Торф зараз шырока вядомы, як каштоўнае гаручае, якое пры ўмелым скарыстоўванні з'яўляецца больш каштоўным чым провы. Торф каштоўны таксама, як угнаенне нашых палёў, якое рэзка павышае іх ураджайнасць. Торф таксама каштоўны, як падсцілка для жывёлы, якая мае вельмі добрыя гігіенічныя і гіграскапічныя ўласцівасці. Урэшце, торф з'яўляецца сыравінай для нашай хімічнай прамысловасці. З торфу можна атрымаць газ, вадкі апал, смолы, бітумы, аміяк, парафінавае масла, фенольс, спірт і т. д. Кожны год навука адкрывае ўсё новыя і новыя ўласцівасці торфу, якія сведчаць, што перад торфам адкрываюцца найшырэйшыя перспектывы для прамысловага скарыстоўвання. Але зараз торф іграе значную ролю ў народнай гаспадарцы СССР.

Замест 1.080 тыс. тон торфу, якія здабываліся ў царскай Расіі, цяперашні час у СССР здабываецца 12.500 тыс. тон, што складае звыш на 1150 проц. Па вытворчасці торфу мы зараз займаем першае месца ў свеце і далёка выперадзілі капіталістычную навуковую думку. Гэта дазваляе нам торф аднесці да галіны вытворчасці, развіццём якой ды цалкам абавязаны Окцябрскай рэволюцыі. На прыкладзе росту торфаздабычы мы бачым яркі доказ здольнасці краіны дыктатуры пролетарыята максімальна скарыстоўваць натуральныя багацці. На прыкладзе торфу гэта тым больш паказальна, што торф, які ідзе да рэволюцыі крыніцай алечы і кабалы шматмільённых мас, зрабіўся крыніцай нашых багаццяў. Окцябрская рэволюцыя літаральна перавярнула старыя ўяўленні пра торф.

Велізарная заслуга ў гэтым належыць асабіста В. І. Леніну, які пастаянна ўважліва сачыў за развіццём торфу. Шматлікія пісьмы і заўвагі Леніна, ужо апублікаваныя ў «Ленинских сборниках», здзіўляюць з якой настойлівасцю, пры выключна цяжкіх умовах, у якіх знаходзілася наша краіна ў гады грамадзянскай вайны, Ленін з'яўляўся арганізатарам новых метадаў торфаздабычы (гідраторф).

XVII партыйны з'езд, як вядома, таксама ўдзяліў аграмадную ўвагу пытанням торфу. Выступленні тт. **Сталіна, Молатава, Куйбышэва, Кірава, Гікало** і рада делегатаў з'езда ярка сведчылі, што пытанні торфу заслужана прыцягваюць шырокую ўвагу нашых партыйных арганізацый. Рашэнні XVII партыйнага з'езда адкрываюць далейшыя перспектывы тарфянай прамысловасці ў СССР. Гэтыя рашэнні XVII партыйнага з'езда і леглі ў аснову работ красавіцкай сесіі Беларускай Акадэміі навук, цалкам прысвечанай распрацоўцы пытанняў торфу і яго прымянення ў народнай гаспадарцы.

Перад сесіяй стаялі задачы: **па-першае,** падвесці вынікі навуковых дасягненняў у галіне торфа вывучэння і праверыць вопыт перадаць для шырокага скарыстання ў народнай гаспадарцы, па-другое, на аснове падвядзення вынікаў навуковых дасягненняў, вызначыць далейшыя шляхі навуковай работы.

Трэба ўпэўнена сказаць, што з пастаўленымі задачамі красавіцкая сесія БелАН справілася. Вялікую дапамогу ў вырашэнні пастаўленых задач аказалі нам буйнейшыя спецыялісты па торфу, якія прыехалі для ўдзелу ў работах сесіі з усіх месц Совецкага Саюза. Красавіцкая сесія тым самым яны ператварылася ва ўсесаюзны з'езд навуковых работнікаў-тарфянікаў.

Другой істотнай акалічнасцю, якая забяспечыла пасяховую работу красавіцкай сесіі, з'явілася шырокае прадстаўніцтва на сесіі гаспадарчых арганізацый і асоб не пасрэдна з вытворчасці: інжынераў, торфмейстэраў, рабочых-ударнікаў і калгаснікаў, якія прымяняюць торфаўгнаенне. Дзякуючы гэтаму сесія праходзіла ва ўмовах выключнай сувязі навукі і практыкі.

Нарэшце, поспеху сесіі садзейнічалі тарфяныя багацці Беларусі, якія дазвалялі разглядаць БССР, як «тарфяны Данбас». Актуальнасць праблемы, якая разглядалася на сесіі, прыцягнула на нашы паседжанні вялікую колькасць рабочых і калгаснікаў. Па прапанове рабочых адно паседжанне секцыі па механічнай апрацоўцы і спальванню торфу праходзіла непасрэдна на электрастанцыі. У ёй удзельнічалі рабочыя Менскай ЦЭЦ, завода імя Варашылава, які вырабляе тарфяныя камбайны, і рабочыя завода «Комунар».

Адно з паседжанняў секцыі па скарыстоўванню торфу ў сельскай гаспадарцы адбылося ў калгасе. Велізарны інтарэс працоўных да работ сесіі з'явіўся важным фактарам поспеху нашай работы. Навуковыя работнікі маглі непасрэдна правяраць свае вопыты і атрымліваць іх ацэнку з боку шырокіх мас, занятых у торфапрамысловасці. У гэтым сэнсе вопыт нашай сесіі заслугоўвае шырокай увагі навуковых устаноў.

Работа сесіі працякала на пленуме і ў секцыях. Усяго быў заслуханы 31 даклад. На пленуме былі заслуханы агульныя даклады праф. **Бахцеева** «Аб значэнні торфу ў роднай гаспадарцы БССР» і праф. **Лепіна** «Становішча вывучанасці тарфянога фонду СССР і БССР». Акрамя таго на пленуме былі заслуханы паведамленні прадстаўнікоў Інстытута торфу т. **Герасімава** (Масква) «Аб перспектывах тарфяной прамысловасці ў СССР», прадстаўніка украінскага інстытута торфу т. **Цыкліяна** «Аб тарфяной прамысловасці УССР», праф. **Клімава** (Ленінград) «Аб Ленінградскай вобласці» і паведамленні галоўнага інжынера Белторфа тав. **Сцяпанава** аб тарфяной прамысловасці БССР.

Галоўная работа працякала ў секцыях па механічнай апрацоўцы і спальванню торфу, у секцыях хімічнай апрацоўкі торфу і ў секцыях па прымянэнню торфа ў сельскай гаспадарцы. Акрамя таго працавала група па выкарыстоўванню торфу ў медыцыне і санітарыі.

Прадметам абгаварэння секцыі па механізацыі торфаздабычы і спальванню торфу з'явіліся даклады навуковых работнікаў на злабадзённыя тэмы: даклад тав. **Ефімава** «Аб сучасным становішчы гідраўлічнага спосабу здабычы торфу і яго перспектывы», інжынера **Салокава** «Аб механізацыі торфаздабычы фрэзерным шляхам», даклады інжынераў **Кісельгофа і Цыперовіча** аб спальванні фрэзернага торфу. Акрамя таго былі прачытаны даклады навуковымі работнікамі **Прахоравым** (аб пераапрацоўцы торфу і механізацыі здабычы торфападсцілкі), інжынерам **Андрыеўскім** (выкарыстоўванне торфу для будаўнічых мэт) і інш.

Секцыя аднадушна прышла да вываду, што не гледзячы на недастатковую распрацаванасць, спосаб гідраторфа з'яўляецца асноўным, найбольш механізаваным і найбольш адпавядаючым запатрабаванням на торф у выглядзе паліва. У адносінах асноўных напрамкаў навукова-даследчай работы прызнана неабходным:

1) разгортванне работы па палепшанню якасці гатовай прадукцыі з тым, каб яна магла скарыстоўвацца для атрымання кокса.

2) адшуканне спосабаў памяншэння расходаў энергіі і метала на адзінку гатовай прадукцыі і па мяншэнне капітальных затрат, і

3) ліквідацыя розных працэсаў цяжкай ручной працы і замена іх механізаванымі спосабамі (разліў, выемка пня, сушка, уборка і штабелёўка торфу).

Прыняты таксама рад рашэнняў па палепшанню работы ў галіне фрэзернага спосабу торфаздабычы і спальвання фрэзернага торфу.

Галоўным прадметам абгаварэння ў секцыі па хімічнай апрацоўцы торфу з'явіўся праект будаўніцтва ў БССР **Прапойскага хімічнага камбіната.** Складанне яго праекта ў сучасны момант фарсіруецца па прапанове тав. **Молатава.** Прапойскі хімічны камбінат будзе мець усесаюзнае значэнне. Торф у гэтым грандыёзным прамысловым прадпрыемстве адначасова з'явіцца энергетычным і сыравінным рэсурсам. Асноўным у Прапойскім хімкамбінаце будзе газавы завод на торфу, які з дапамогай электрацэнтралі забяспечыць вытворчасць тукавага, фосфарнага і смалянога цэхаў. Прапойскі хімкамбінат—грандыёзны па магутнасці, з'явіцца адным з гігантаў будучай Беларусі—краіны з высокага развітай хімічнай прамысловасцю, як вядучай галінай.

Прадметам шырокага абгаварэння хімічнай секцыі з'явіліся таксама пытанні атрымання з торфу розных хімпрадуктаў. У прыватнасці секцыя вельмі адабральна аднеслася да вопытаў навуковага работніка **В. В. Жукава** (БССР), які дабіўся атрымання з торфу эцілавага спірта без прымянення мінеральных кіслот.

У секцыі па прымяненню торфу ў сельскай гаспадарцы былі заслуханы цікавыя даклады праф. **Бахцеева** «Аб прымяненні торфу як угнаення», праф. **Кабанава** «Аб торфападсцілках для жывёлы», праф. **Пратасені** «Аб эфектыўнасці торфу як угнаення на падзолістых глебах», праф. **Цыцыліяна** «Аб прымяненні торфу як угнаення і для торфападсцілак у УССР», праф **Дакукіна** «Аб вывучэнні сельскагаспадарчых культур балот», **Зубіятава** «Торфападсцілачная вытворчасць у СССР» і тав. **Драгунова** «Аб прымяненні тарфяных канцэнтратаў».

У групе прымянення торфу ў медыцыне і санітарыі вялікую ўвагу выклікаў даклад д-ра **Ягубава** «Торф як лячэбны сродак», у якім дакладчык падзяліўся вопытам аб прымяненні торфу для лячэбных мэт у нас і заграніцай.

У гэтым артыкуле мы, зразумела, не прэтэндуем на поўны агляд работ секцыі. У сувязі з тым, што красавіцкая сесія вылілася ва ўсесаюзны з'езд навуковых работнікаў-тарфянікаў, прэзідыум Беларускай Акадэміі навук апублікуе працы сесіі на рускай і беларускай мовах.

Адзначаючы вялікае значэнне красавіцкай сесіі БелАН, трэба перш за ўсё падкрэсліць яе вялікую зарную ролю ў справе развіцця народнай гаспадаркі БССР. За гады рэволюцыі торфапрамысловасць Беларусі пайшла далёка наперад. Ужо ў сучасны момант толькі ў адной Беларусі здабываецца торфу больш чым у царскі час па ўсёй Расіі. Аднак, гэтыя поспехі ў сувязі з індустрыялізацыяй БССР не могуць нас задаволіць. Мы маем усе даныя для больш магутных тэмпаў развіцця торфапрамысловасці ў БССР і шырокага скарыстоўвання торфу як апала, угнаення і для хімічнай прамысловасці. Тарфяныя балоты ў БССР складаюць прыкладна 1/10 яе тэрыторыі. Вялікая перавага беларускіх тарфяніцтваў—гэта роўнамернасць размяшчэння тарфяных балот. Якасць і каларыйнасць беларускага торфу вышэй саюзных норм. Большасць беларускіх торфаў вельмі добра каксуецца. Не гледзячы на ўсе гэтыя якасці, на жаль, у апалавым балансе БССР торф складае толькі 14 процантаў. Зусім праў быў тав. **Куйбышэў**, які паставіў на XVII партыйным з'ездзе перад БССР задачу больш фарсіраванага ўнядрэння торфу ў нашы гаспадаркі. Цяжкасць і перэндабельнасць для народнай гаспадаркі БССР карыстання прывозным вугалем востра ставяць задачу максімальнага скарыстоўвання торфу як апалу. Гэтым мы захаваем нашы лясы, якія ў самы бліжэйшы час павінны быць скарыстаны толькі для будаўнічых мэт.

Сесія з відавочнасцю даказала таксама, што ў Беларусі праблема павышэння ўраджайнасці можа быць вырашана толькі пры ўмове максімальнага скарыстоўвання торфу як угнаення.

Нарэшце, сесія выявіла, што торф павінен [illegible] асноўным [illegible] нашай [illegible] гаспадарцы БССР. Ч[illegible] зрабіць вынікі сесіі [illegible] здабыткам шырокіх мас і ўнядрыць іх у вытворчасць.

НАРАДА РАБКОРАК-ШВЭЙНІЦ

(Ад віцебскага карэспандэнта «Звязды»)

19 красавіка ў клубе гаркома пар адкрылася ўсебеларуская нарада рабкорак швэйнай прамысловасці. З дакладам аб рэалізацыі рашэнняў XVII з'езда партыі і задачах швэйнай прамысловасці выступіў загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК т. **Готфрыд.**

Адзначаючы дасягнутыя поспехі ў рабоце швэйнай прамысловасці, асабліва фабрык «Сцяг індустрыялізацыі» і «Профінтэрн» як рэзультат барацьбы за рэалізацыю рашэнняў XVII з'езда партыі, тав. **Готфрыд** адначасова канцэнтруе ўвагу нарады па паяўных яшчэ вялікіх недахопах. Адным з галоўных недахопаў—нерацыянальнае скарыстанне сыравіны. Вялікі перарасход сыравіны на магілеўскай швэйнай фабрыцы імя Валадарскага і фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» (Віцебск).

На радзе прадпрыемстваў,—гаворыць тав. Готфрыд,—таксама адсутнічае неабходная барацьба з недапушчальнай з'явай—пакражай прадукцыі. Толькі на адной фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» за мінулы год украдзена **1200** пінжакоў і **4100** пар штаноў.

Пераходзячы да пытання аб якасці прадукцыі, дакладчык адзначае кансерватыўнасць асобных прадпрыемстваў у сэнсе нежадання асвоіць новы асартымент прадукцыі. Асабліва супроць асваення новых асартыментаў вялі барацьбу фабрычныя арганізацыі гомельскай фабрыкі «Комінтэрн». Гэтым самым яны паставілі сябе супроць рэалізацыі рашэнняў XVII з'езда партыі.

Аб дрэннай якасці прадукцыі сведчаць вялікія штрафы, накладзеныя Саюзшвэйзбытам на рад швэйных прадпрыемстваў.

У ліквідацыі ўсіх гэтых недахопаў вялікую ролю павінны адыграць рабкоры, у прыватнасці рабкоркі-швэйніцы. Мабілізуючы і арганізуючы шырокія слаі рабочых і работніц на барацьбу з усімі вышэйўказанымі недахопамі, рабкоры ў той-жа час павінны ўсяляк дабівацца хутчэйшага рэагавання на свае заметкі.

З садакладамі выступілі кіраўнік Швэйтрэста т. **Карасік** і прадстаўнік Саюзшвэйзбыта т. **Драгілеў.**

Стрыжань іх выступленняў—якасць прадукцыі, укараненне гаспадарчага разрахунку, барацьба з рознымі недахопамі на вытворчасці.

Першы дзень работы нарады закончыўся выступленнем дэлегатак-рабкорак, якія дзяліліся з трыбуны канферэнцыі вопытам сваёй работы.

Тав. **Мельнікава** (фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі»—Віцебск) расказала аб тым, як яе брыгада ў барацьбе за тэмпы і якасць дабілася звання імя Сталіна. Тав. **Падольская** (ф-ка «Окцябр», Менск) перадала вопыт барацьбы рабкорак фабрыкі за асваенне новага асартымента прадукцыі.

З крытыкай работы Швэйтрэста выступіў рэдактар газеты-шматтыражкі фабрыкі «Комінтэрн» (Гомель) тав. **Левітан**, які асабліву ўвагу звярнуў на бяспланавасць трэста ў пытанні ўвядзення новага асартымента.

Рабкорка фабрыкі імя **Дзержынскага т. Меерзон** завастрыла ўвагу нарады па пытанні аб дрэннай пастаноўцы тэхвучобы на фабрыцы.

Аб вопыце работы штодзённкі цэха дзіцячага паліто фабрыкі «Профінтэрн» (Віцебск) выступіла рабкорка тав. **Піскуновіч.** Штодзённка цэха здолела мабілізаваць рабочых на ліквідацыю прарыва, на ўзняцце якасці прадукцыі.

На апёце выступіў сакратар гаркома КП(б)Б тав. **Жураўлёў.**

Арк. **ЗАРУБЕЖНЫ.**

ХВАРОБЫ ГОМЕЛЬСКАГА ДРЭВАКАМБІНАТА

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Першы квартал па гомельскім дрэваапрацоўчым камбінаце імя **Гікало** не даў палепшання ў рабоце. План быў выканан на **75,8** проц. Горш усіх цэхаў працаваў мэблевы. У студзені ён выканаў план на **7,2** проц., у лютым — на **29,6** і ў сакавіку — **57.**

Паточная сістэма не наладжана. Асабліва гэта адчуваецца ў мэблевым цэху. З-за дрэннай арганізацыі працэсаў — круглае крэсла, напрыклад, трапляе для апрацоўкі з гакарна-шліфавальнага аддзялення ў гнутарнае два разы. Няправільная расстаноўка сіл, і частая змена рабочых на працэсах зрываюць роўнамерны выхад дэталей. Брыгадзір **Лешчакоў** заяўляе, што адсутнасць царг сістэматычна зрывае зборку крэслаў. Начальнік цэха **Караневіч** і тэх нарук **Пабочый** не прымаюць ніякіх мер да знішчэння гэтых непаладак. Начальнік абознай вытворчасці **Дончанка** і тэхнарук **Харашун** займаюцца толькі пытаннем зборкі калёс, бо па гэтых паказальніках вылічваецца выкананне промфінплана. Цэхам-жа, дзе вытвараюцца папярэднія працэсы, увагі аддаецца вельмі мала. Таму першы калёсны цэх у канцы сакавіка меў чатыры дні прастою з-за адсутнасці дубовага кражу і спіц.

Многія нормы заніжаны. Кіраўнікі цэхаў не змагаюцца за правільнае тэхнічнае нармаванне. Аб гэтым вельмі ярка сведчыць такі факт. Рабочы электразварачнага цэха **Усянкоў** перавыконвае сваю норму больш чым на 200 проц. Ён падаў у ТНБ і цэхкому дзве заявы аб пераглядзе нормы, але ўсё засталося па-ранейшаму.

Дрэннае кіраўніцтва прыводзіць да вялікай колькасці браку. Асаблівых размераў ён дасягнуў у тым-жа мэблевым цэху. Бракаробы не нясуць матэрыяльнай адказнасці за зробленую ім страту. Брыгадзіры дрэнна сочаць за выкананнем якасных паказальнікаў.

Зусім забылі на камбінаце аб спажывецкай якасці прадукцыі. Мэблевы цэх выпускае ўсяго два віды крэслаў і адзін—поўкрэсла. Крэслы пераважна афарбоўваюцца ў цёмны колер. Пярэднія ножкі многіх крэслаў занадта выгнутыя, няпрыгожыя. Рад дэфектаў маюць і павозкі. Калгаснікі калгаса **«Чырвоны будаўнік»**, Прыбарскага сельсовета, скарджацца, што колы ў павозцы пастаўлены шырэй, чым у звычайных. Каб пазбегнуць цяжкага ходу павозкі не па калёінах, прышлося ўкараціць восі. У калгасе **«Інтэрнацыянал»**, Касцюкоўскага сельсовета, калгаснікі **Гаўрыленка** і **Гапаеў** указалі на тое, што задняя частка кузава большая чым пярэдняя. У выніку гэтага немагчыма роўнамерна нагружаць павозку. Дышла кароткае. Развесці восі шырэй, напрыклад, для возкі драўніны, нязручна. Гэтыя недахопы калгаснікі лічаць неабходным неадкладна ліквідаваць. Яны таксама выказаліся супроць таго, што камбінат ў апошні час выпускае павозкі без кузаваў.

На прадпрыемстве ёсць многа, адыходаў, але скарыстанне іх не наладжана. Рабоце уцільцэха не аддаецца ніякай увагі. За год яго тры разы перакідвалі з памяшкання ў памяшканне. Цяпер перакінулі ў чацвертае. Апрацоўка дэталяй будзе рабіцца ў адным месцы, а зборка ў другім, на адлегласці каля кілометра. Цэх выпускае толькі мэблю для дзіцячых ясляй, у той час, калі ён можа вырабляць добрыя дубовыя крэслы, пісьменныя сталы.

Перабоі ў снабжэнні драўнінай і жалезам адбываюцца ў значнай меры па віне Белдрэва. У вытворчым аддзеле трэста ёсць адказныя за мэблю, абоз і трубы, за шырспажыў і новыя віды экспарта, за лесапіленне, за пілапастаўную справу, за цеплавую гаспадарку і т. д. — 12 адказных! Ёсць усё, **але няма... сапраўднай адказнасці і кіраўніцтва прадпрыемствамі.**

МІХ. РАБІНОВІЧ.

БУКЕТ ШКОДНІКАЎ

Мясцовы транспарт, асабліва аўтамабільны, з'яўляецца лепшым памочнікам чыгункі. Ён паскарае грузазварот паміж прамысловасцю, кааперацыяй і сельскай гаспадаркай. У **Віцебску** гэтага не разумеюць. Кантора **Белдзяржтранса** не змагаецца за прадукцыйную работу аўтатранспарта. Сістэматычна не выконваецца вытворчы план па аўтаперавозках. За 1933 год ён выкананы на 73,4 проц. (у тонах), па тонакілометрах—на **74,3** проц.

Раскрадванне грамадскай уласнасці ў аўтагаспадарцы лічыцца нармальнай з'явай. Бензін у віцебскім гаражы кралі і выносілі вёдрамі. Намеснік дырэктара канторы т. **Валчок**, які непасрэдна адказвае за гэта, ніякіх мер не прыняў супроць зладзеяў. У час правядзення месячніка-конкурса па эканоміі гаручага **Валчок** заявіў:

— Нам месячнік праводзіць не трэба, бо гаручага ў нас больш чым вады.

Ва ўсёй сістэме Белдзяржтранса расцвіла бязгаспадарчасць, разгільдзяйства і «очковтирательство». За 1933 год перавыдатакавана фонда заработнай платы на **42.414 руб.** Гэтаму кіраўнік віцебскай канторы **Сямёнаў** не надае ніякага значэння. Фонды зарплаты паранейшаму разбазарваюцца.

Перавозкамі ніхто не кіруе. На гарадскіх складах Белдзяржтранса гніюць тавары Швэйзбыта. Пагнілo больш **50** мужчынскіх і жаночых польтаў.

Па-шкодніцку працуе экспедыцыя. За засылку і псаванне грузаў выплачана **22.801** руб.

Кантора засмечана класавачужымі элементамі. Загадчыкам экспедыцыі працуе нейкі **Рэвзон**, былы ўласнік **20** коняй. Калі **Рэвзона** павінны былі зняць з работы і аддаць пад суд, дырэктар канторы **Сямёнаў** і яго намеснік **Валчок** дагаварыліся яго проста аслабаніць ад работы. Выявілася, што яны разам п'янствавалі.

У катастрафічным становішчы ўсе **18** аўтамашын гаража. Рамонт праводзіцца яўна нездавальняюча. Машыны больш прастойваюць у рамонце, а ў гэты час тут-жа ў гаражы часта п'янствуюць старшы механік **Ласкацёнак**, механік **Гладкоў** і сумесна з імі **Валчок** і **Сямёнаў.**

З вялікім спазненнем дзеянні гэтай бойкай шайкі сталі вядомы віцебскім арганізацыям. Але і тут **Валчок і Сямёнаў не замяшаліся.** Яны літаральна пачалі цкаваць былога старшыню групкома, які вы крываў усе іх махінацыі і прымусілі яго пакінуць работу. Тое-ж здарылася і з новым групкомам саюза.

Аб усім, што робіцца ў віцебскай канторы Белдзяржтранса ведала кіраўніцтва беларускай дырэкцыі—тав. **Хмель** і яго намеснік **Санковіч.** Ведалі і маўчалі. Чаму? Таму, што **Хмель** калісці працаваў сумесна з **Валчком** і **Сямёнавым.** Нельга-ж псаваць прыяцельскія ўзаемаадносіны. І тав. **Хмель** свядома замазваў дзеянні злачынцаў.

Нарэшце, гэтай справай заняўся прэзідыум ЦП саюза шофераў. Доўга спрачаліся на пасяджэнні, як ацаніць работу віцебскай канторы і парашылі адзначыць зусім дрэнную работу гарадскога групкома саюза. Так мякка падышлі таму, што былы старшыня ЦП саюза т. **Плікус** таксама абараняў віцебскіх заправіл. Невыпадкова ён на працягу пяці месяцаў марынаваў справу аб злачынцах.

Так цягнецца ад аднаго бюракрата да другога справа аб шкодніках социялістычнай маемасці.

Вось чаму ў віцебскай канторы Белдзяржтранса паранейшаму арудуюць **Сямёнаў, Валчок** і К°. Паранейшаму бензін льецца як вада, сотні тысяч дзяржаўных грошай выкідваюцца на вуліцу.

БЕЛАЗОЎСКІ, ЛЕВІН, АБЕСОГАМЯН.

Ад РЭДАКЦЫІ. Пракуратура рэспублікі і ЦСПСБ павінны неадкладна ўмяшацца ў гэту справу.

ДАЙЦЕ НАМ ДОБРЫ КІНО-ФІЛЬМ

(Пісьмо калгаснікаў).

Кіно-перасоўка прыязджае ў наш калгас **«Шлях комунізма», Добрасневіцкага сельсовета (Магілеўскі раён)** рэгулярна адзін раз у месяц. Нашы калгаснікі вельмі хочуць паглядзець кіно. Калі прыязджае перасоўка, то прыходзіць не толькі моладзь, але і старыкі па 60-70 год. Асабліва нашы калгаснікі любяць, калі паказваюць светавую газету па матэрыялах калгаса. Але ў апошні час светавая газета не выпускаецца. Кіномеханік кажа, што Аршанскае аддзяленне Белдзяржкіно не прысылае чыстай плёнкі.

Цяпер мы хочам сказаць **якія кіно-карціны нам прысылае** Аршанскае аддзяленне Белдзяржкіно. Месяц таму назад у нашым калгасе паказвалі кіно-карціну **«Трэцяя маладосць»**, якая да калгаснага экрана не падыходзіць. Яна не дае нічога карыснага калгаснику, бо ідэалізуе арганізацыю таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі. У карціне не паказана класавая барацьба на вёсцы.

9 красавіка ставілася кіно-карціна **«Арначэўская пазма»**, у якой паказваецца жыццё народаў Усхода. Нам вельмі цікава ведаць як жывуць працоўныя на ўсходзе, але карціна нават пры добрым тлумачэнні кіномеханіка засталася незразумелай. Прыслалі карціну **«Вясёлая вайна»**, у якой праз усе 7 частак маленькія дзеці гуляюць у мячык. У канцы сеанса засталося 5—7 чалавек. Палітаддзел МТС ужо даве такіх карціны адсылаў назад, як непадыходзячыя. Але Аршанскае аддзяленне Белдзяржкіно прадаўжае слаць тое, што ў іх залежваецца.

Наш калгас уступіў у паласу масавай сяўбы. Мы хоць адзін раз у месяц хочам паглядзець добрую совецкую карціну.

Дайце нам добры мастацкі фільм як «Твар ворага», «Вір», «Зямля», «Яго прызыў», «Маці». Дайце нам фільм, які паказвае гераічную барацьбу пролетарыята за Окцябр — «26 камісараў», «Броненосец Пацёмкін».

Мы хочам паглядзець добрую совецкую камедыю, фільм, які паказвае жыццё пролетарыята за мяжой—«Нянавісць» і т. д. Пакажыце нам добры абарончы фільм, добрую агратэхнічную хроніку.

Аршанскае аддзяленне не хоча задаволіць нашых патрабаванняў.

Мы просім трэст Белдзяржкіно задаволіць нашу просьбу і прысылаць нам адпаведныя кінофільмы.

МОЦКІН, РУЦЬКОЎ, ХАЛАДЦОЎ, АКУЛАЎ, ПАГАНКОЎ, АВЕРКАЎ, ЗУБОВІЧ Н., АЛІНЧАКОЎ, АЎЧЫННІКАЎ, ДЗЕМ'ЯНАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Белдзяржкіно павінна прыняць практычныя меры да палепшання абслугоўвання калгасаў кінофільмамі, улічыўшы пры гэтым рост культурных запатрабаванняў калгаснай вёскі. Паведамленне аб гэтых мерах «Звязда» чакае ў самы бліжэйшы час.

ПОЎНАСЦЮ РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАЗЫКУ Ў ПАДШЭФНЫХ СЕЛЬСОВЕТАХ І КАЛГАСАХ— СПРАВА ГОНАРУ КОЖНАЙ ФАБРЫКІ І ЗАВОДА

ЗА СЕМ ДЗЁН

НА 22 КРАСАВІКА, ПАВОДЛЕ ДАНЫХ ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА АПІЧАДКАСАМІ, ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ ДРУГОГА ГОДА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ ПА БССР ДАСЯГНУЛА **46.887** ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ, ШТО СКЛАДАЕ 64.1 ПРОЦ. ПЛАНА.

ПА ГРУПЕ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ РЭАЛІЗАВАНА ПАЗЫКІ НА 43.400 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ.

СЛАБА ПРАХОДЗІЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ. УСЯГО Ў ВЁСЦЫ РАЗМЕШЧАНА АБЛІГАЦЫЙ НА СУМУ 3.487 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ. **ЧАШНІЦКІ, ЖЫТКАВІЦКІ, СУРАЖСКІ** РАЁНЫ ДА 22 КРАСАВІКА НЕ ПАЧАЛІ ЯШЧЭ ПАДПІСКІ НА ВЁСЦЫ.

НАПЕРАДЗЕ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ ІДУЦЬ **МЕНСКІ, СЛУЦКІ І СТАРОБІНСКІ** РАЁНЫ.

МОПРАУЦЫ ДАПАМАГАЮЦЬ РЭАЛІЗАЦЫІ

17 красавіка ўвесь апарат ЦК МОПР БССР на чале з старшынёй ЦК акадэмікам **Домбалем** выехаў у Пухавічы, для дапамогі раённым арганізацыям у рэалізацыі пазыкі.

Прыехаўшыя таварышы правялі два вялікія інтэрнацыянальныя вечары: у раённым цэнтры Мар'іна-Горкі і ў мястэчку Пухавічы. Вечары прайшлі пад лозунгам хутчэйшай рэалізацыі пазыкі, паспяховага правядзення веснавой сяўбы, максімальнага ўмацавання мопраўскай арганізацыі. У вечарах прынялі ўдзел чыгуначнікі, калгаснікі з мясцовых і бліжэйшых калгасаў, члены саматужных арцелей, студэнты і інш.

Калгасы «Окцябр» і «Ўраджайны край» рапартавалі аб поўным ахопе пазыкай усіх калгаснікаў і абавязаліся дапамагчы ў рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў.

Вынікі праведзеных мерапрыемстваў такія. Напрыклад, у Пухавіцкім сельсавеце раніцой 17 красавіка падпіска складала 1200 руб., а на наяўны разлік нічога не было рэалізавана. А ўжо к вечару было сабрана падпіскі на **17.000** руб. і за наяўны разлік прадана аблігацый на **1.300 руб.**

18 красавіка ў раён дадаткова накіраваны два чалавекі.

Е. ЗЕЛЬМАНАЎ.

З ФРОНТА РЭАЛІЗАЦЫІ

(ПА ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОН У АД НАШЫХ КАР. І БЕЛТА)

ОРША.

Падпіска на пазыку сярод ЧЫГУНАЧНІКАЎ АРШАНСКАГА ВУЗЛА праходзіць з вялікім поспехам. На 18 красавіка рэалізавана пазыкі па 5-му вагоннаму ўчастку на 78.112 р.; па 4-му паравознаму ўчастку — на 129.305 руб. Па 6-й дыстанцыі пуці на—94.200 руб., па 4-й дыстанцыі сувязі— 42.295 руб. Калектыў рабочых і служачых станцыі Орша-цэнтральная падпісаўся на 51.520 руб., Орша-заходняя — на 13.615 руб.

Адстаюць у падпісцы рабочыя, звязаныя з часовымі пераездамі. Яны будуць ахоплены ў бліжэйшыя дні.

ГАСМАН.

***

ХОЙНІКІ. Ва ўсіх калгасах і соўгасах раёна адбыліся мітынгі, прысвечаныя пазыцы другога года 2-й пяцігодкі. Ашчадкаса арганізавала ва ўстановах і соўгасах стапы даведак, дзе можна атрымаць растлумачэнне аб умовах падпіскі на пазыку.

Па Алексіцкаму сельсавету рэалізавана аблігацый на суму 5.575 руб., ахоплена 205 калгаснікаў. Па Страль чацкаму сельсавету рэалізавана пазыкі на 6.600 руб., падпісалася 166 калгаснікаў.

Да 22 красавіка падпіска па Хойніцкаму раёну дасягнула 387 тыс. руб. Сярод калгаснікаў рэалізавана аблігацый на 101 тыс. руб.

ШВАРЦ.

***

БАБРУЙСК.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імя 518 прынялі самы актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі. За адзін вечар было сабрана падпіскі на 800 руб. Калгаснікі Міхась Пятрушка, Беляўскі, Ясевіч і Клевуцкі падпісаліся па 100 руб. кожны. Яны актыўныя агітатары за новую пазыку.

П. Ч.

МСЦІСЛАЎЕ. У калгасе імя Чарвякова не засталося ні аднаго калгасніка, які-б не падпісаўся на пазыку. Рэалізавана пазыкі на 5.200 р. ЧАЦВЕРТАЯ БРЫГАДА НЕПАСРЭД НА НА ПОЛІ Ў ЧАСЕ ПЕРАПЫНКУ АБГАВАРЫЛА ДЭКРЭТ УРАДА АБ ВЫПУСКУ ПАЗЫКІ І ПАДПІСАЛАСЯ НА 1.200 РУБ.

Усе калгаснікі с.-г. арцелі імя Будзённага падпісаліся на трохтыднёвы заработак.

З вялікім поспехам праходзіць падпіска па гораду.

ЯН. НОВІКАЎ.

***

ДЗЯРЖЫНСК.

Рэалізацыя пазыкі сярод працоўных польскага нацыянальнага Дзяржынскага раёна дасягнула 445 тыс. руб. На першым месцы па падпісцы ідуць калектывы МТЗ, МТС і леспрамгаса. Рабочыя леспрамгаса паслалі ў калгас «Комінтэрн № 1» брыгады для правядзення масавай работы. Перадавы па падпісцы — Новасёлкаўскі сельсавет, дзе падпіскай ахоплена пераважная большасць рабочых, служачых і калгаснікаў.

***

ПОЛАЦК.

Паміж калгасамі, калгаснымі брыгадамі і дзесяцідворкамі раёна разгарнулася соцспаборніцтва на лепшую падпіску. У калгасе імя Сталіна, Баярскага сельсавета, падпіскай ахоплены ўсе калгаснікі. Рэалізавана аблігацый на 2000 руб.

Поўнасцю ахоплены падпіскай і калгаснікі «Чырвонага шляху» і «Молата», Тураўлянскага сельсавета.

12 аднаасобнікаў мазаеўскага пункта, Ветрынскага сельсавета, падпісаліся на 540 руб. і выклікалі на соцспаборніцтва сердаўскі пункт. У вёсцы Грамы 28 аднаасобнікаў набылі аблігацыі на 780 руб.

М. КЛІМКОВІЧ

ПРА ТЭМАТЫКУ СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРЫ БССР

ДА 1-ГА УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Разглядаючы творы пісьменнікаў БССР за апошнія 2-3 гады, мы бачым рознастайнасць тэм, ахопленых імі.

З індустрыяльнай тэматыкі распрацаваны: будаўніцтва буйнейшых гігантаў не толькі ў БССР, але і ў СССР, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, перавыхаванне адсталых слаёў рабочых, галоўным чынам, выхадцаў з вёскі, з мястэчка, з дэкласаваных элементаў, барацьба з класавым ворагам на заводзе, з шкодніцтвам і т. д.

З калгаснай тэматыкі мы маем ужо некалькі рэчаў пра цалітаддзелы МТС, пра МТМ. Кола тэм нашых твораў ахапляе ўжо не толькі перыяд арганізацыі калгасаў, але і пазнейшыя перыяды барацьбы за гаспадарчае і арганізацыйнае ўмацаванне калгасаў, за заможнасць калгаса і большэвізацыю калгаса.

На лініі нацыянальнай палітыкі мы маем паказ барацьбы КП(б)Б супроць беларускіх нацдэмаў на працягу ўсіх гадоў існавання совецкай улады на Беларусі. Многія тэмы ахапляюць пытанні інтэрнацыянальнай пролетарскай салідарнасці. Навялічылася асвятленне абарончай тэматыкі і т. д. Аднак, не гледзячы на рознастайнасць тэм, якія распрацоўваліся пісьменнікамі БССР, трэба падкрэсліць, што совецкая беларуская літаратура ўсё-ж адстае ад тых запатрабаванняў, якія прад'яўляе ёй наша грамадскасць. І гэта адасабляе верным, хоць сучасная беларуская літаратура далёка адышла ад таго часу, калі нацдэмы ў літаратуры стваралі (на пэўным этапе не без поспехаў) зачараванае кола выключна вясковай сляпівай тэматыкі, сляпа лівага аплакванне нашай сучаснасці, стваралі кола нацыячальнай абмежаванасці, правінцыяльнай замкнутасці. Нам удалося разарваць гэтае кола, дыскрэдытаваць яго і накіраваць сю пісьменніцкую масу на шырокі шлях усебаковага адлюстравання нашай гераічнай эпохі.

Аднак, мы не можам сказаць, што ўсе віды тэматыкі прадстаўлены ў беларускай літаратуры аднолькава шырока. Калі, скажам, тэмы арганізацыі калгасаў распрацаваны большменш грунтоўна (Галавач **«Спапох на загонах»**, Зарэцкі **«Вязьмо»**, **«Сына Карызна»**, кіно-сцэнарый **«Пачатак шчасця»**, Колас **«Адшчапенец»**, Купала **«Над ракой Арэсай»**, Куляшоў **«Аманал»** і **«Гарбун»**, часткова К. Чорны ў **«Бацькаўшчыне»**, этапы перад социялістычнай рэканструкцыяй вёскі—**«Мядзведзічы»** Крапівы, **«На чырвоных лядах»** Лынькова, **«Язэп Крушынскі»** З. Бядулі), то сучасны стан калектывізацыі, барацьба за большэвіцкі калгас, за заможнае культурнае жыццё толькі пачынаюць распрацоўвацца. У гэтым напрамку трэба адначыць творы Александровіча—**«Хлебная зіма»** і **«Векапомная восень»**, п'есу Глазырына **«Фронт»**, нарысы Броўкі і Глебкі **«Ураджай»**, п'есу Ільінскага **«Хвароба Лаўрэна»** пра надзяленне бескароўных цёлкамі, п'есу Траецкага **«Нашы козыры»** пра працадзень, п'есу Міровіча **«У вясновую ноч»** пра МТМ, рад навел Скрыгана, рад апавяданняў маладых пісьменнікаў, напрыклад, т. Самуйленкі **«Палянічае шчасце»** пра выхаваўчую ролю калгаса; **«Свяцтва»** тав. Капылёўскага пра барацьбу за здачу ільну дзяржаве, апавяданні і вершы Сабаленкі, Лагвіновіча, Манцэвіча і інш.

Беглы пералік твораў, якія ў той ці іншай ступені закранаюць сёнешняе жыццё калгаса, паказвае, што тут мала моцных рэчаў, якія-б не краем, а моцна падымалі ўсю складанасць і шматграннасць барацьбы, што праводзіць рабочы клас па кардынай перабудове і вёскі і працоўнага селяніна. Асабліва слаба адлюстравана ў літаратуры работа палітаддзелаў МТС. Зусім не закранута соўгасная тэматыка. Няма паказу новай жанчыны вёскі—кіраўніка і арганізатара калгаса, хоць жыццё дадало нам нямала падобных вобразаў.

Адна з задач оргкамітэта ССПБ была і астаецца надалей—высоўваць перад пісьменнікамі актуальныя праблемы, якія патрабуюць сур'ёзнай увагі. З'езд павінен падкрэсліць адставанне літаратуры ў даным напрамку і стаць стымулам ліквідацыі гэтага адставання.

Яшчэ большую ўвагу павінен звярнуць з'езд на адставанне літаратуры ў галіне індустрыяльнай тэматыкі. Совецкая Беларусь за гады першай пяцігодкі ператварылася з адсталай аграрнай краіны ў краіну індустрыяльна-калгасную, прайшоўшы гэты этап небывалымі тэмпамі (прадукцыя прамысловасці ў параўнанні з даваенным часам павялічылася амаль на 1000 проц.). Між тым, апрача **«Капандраў»** Броўкі (на матэрыяле Добружскай фабрыкі) «Напоры» Александровіча (на матывах Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната), **«Шоўку»** Доўгаполыскага (на яўрэйскай мове, на матэрыяле Магвалакно) мы амаль нічога не маем, калі не лічыць раду вершаў пра сталінскую ДРЭС, пра торфападачу (сярод іх лепшая паэма тав. Харыка **«У канвееры дзён»** на яўрэйскай мове).

Толькі апошні год даў некаторы, дый то нязначны, зрух у гэтым пытанні. Тав. Шынклер выдаў кніжку **«Сонца пад шпалы»** і напісаў новую кніжку **«Запіскі інструктара Томана»** пра чыгуначны транспарт, тав. Рамановіч напісаў п'есу пра будаўніцтва рабочага пасёлка, Лынькоў напісаў два апавяданні, а тав. Галавач нарыс пра Беламорбуд, т. Мікуліч—апошнюю частку свайго рамана **«Дужасць»**, пабудаваную на матэрыялах Магнітабуда, тав. Знаёмы напісаў аповесць **«Біяграфія майго героя»** на матэрыялах завода імя Варашылава, тав. Крапіва ў п'есе **«Канец дружбы»** ўдала ахапіў жыццё і работу таксама машына-будаўнічага завода, тав. Дулар распачаў паэму пра завод **«Большэвік»**, тав. Казлюк (зав. імя Варашылава) напісаў апавяданне для даяцей пра Горкаўскі аўтазавод. Выступілі з радам апавяданняў пачынаючыя пісьменнікі: Казлоўскі—пра класавага ворага на заводзе, Мельнік — пра рабочую моладзь, Пашута—пра транспарт.

Трэба проста сказаць, што якасць большасці гэтых твораў стаіць на значна ніжэйшым узроўні, чым, скажам, якасць твораў пра вёску. Тлумачыцца гэта, па-першае, недастатковым знаёмствам лепшых нашых пісьменнікаў з прадпрыемствамі, з тэхнікай вытворчасці, а, па-другое, слабай арганічнай сувязю з рабочымі калектывамі, недастатковым знаёмствам з бытам рабочых. Вось чаму само жыццё завода больш рознастайнае і багатае, чым яно паказана ў творах пісьменнікаў.

Незнаёмства з працэсамі вытворчасці прыводзіць часта да надуманасці сюжэта і тых супярэчнасцяй, якія разгортваюцца ў паказе жыцця завода. Гэта з'яўляецца і прычынай адсутнасці твораў, у якіх-бы ставіліся навукова-тэхнічныя праблемы, у прыватнасці вынаходства.

У паказе соцспаборніцтва ўсё яшчэ ў значнай меры пануе штамп. У ім не адчуваецца сапраўдны гонар перадавіка кадравага рабочага, які выпрацаваў у сябе новыя социялістычныя адносіны да працы, да варштата, да фабрыкі, а не проста змагаецца ў парадку рэкардсменства ці голага павышэння зарплаты. Не паказана яшчэ не толькі барацьба за аўладанне тэхнікай (гэту тэму закранае толькі тав. Знаёмы), але нават і працэс пуску новага завода. Таму вельмі станоўчым з'яўляецца намер тав. К. Чорнага дэтальна вывучыць рабочы калектыў завода імя Ланцуцкага і напісаць роман на матэрыяле гэтага завода, а таксама намер тав. Зарэцкага папрацаваць з такой-жа мэтай на гіганце-шклозаводзе імя Сталіна ў Касцюкоўцы.

Для нас, як прымежнай рэспублікі, вялікае значэнне мае абарончая тэматыка. На жаль, пытанні абарончай тэматыкі таксама слаба ахоплены. Пытанні грамадзянскай вайны распрацаваны больш шырока і дасканала, затое адлюстраванне сучаснай Чырвонай арміі пастаўлена яўна нездавальняюча. Калі ў паказе грамадзянскай вайны ёсць такія рэчы, як **«Босыя на вогнішчы»**, **«Сын партызана»**—Чарота, **«Дрыгва»** Якуба Коласа, **«Пясок гарыць»** Крапачова, **«Пункт апоры»** Самуйленка, **«Чацвертае спатканне»**, **«Камандзір броненосца»** Галавача, **«Шымон Свісь»** тав. Кавальскага (на польскай мове), рад апавяданняў Лынькова, К. Чорнага, рад вершаў Александровіча, Харыка, Броўкі, Глебкі і іншых паэтаў, калі пытанні грамадзянскай вайны ў значнай меры закранаюцца такімі творамі, як **«Канец дружбы»** Крапівы, **«Маці»** Гурскага, **«Фронт»** Глазырына і рад іншых (я пералічваю толькі творы, якія напісаны за апошнія два гады, апрача **«Босыя на вогнішчы»**),—то сучасныя тэмы абароны краіны распрацаваны толькі ў аповесці **«Тэорыя Каленбрун»** Самуйленка, **«Талісман»** Лынькова, **«Лётнікі»** Броўкі і Глебкі, радзе апавяданняў і вершаў, галоўным чынам, маладых пачынаючых пісьменнікаў Чырвонай арміі, змешчаных у зборніку **«Атака»**. Да рэчы, гэты зборнік здан у друк яшчэ ў студзені, але да гэтага часу ДВБ не здолела яго выпусціць. Адлюстраваны гэтыя тэмы яшчэ ў радзе вайсковых песень, напісаных тт. Гаўсманам, Кручкіным, Кляшторным і інш. Зноў такі незнаёмства з жыццём, вучобай і бытам Чырвонай арміі з'яўляецца адной з галоўных прычын, чаму пісьменнікі БССР такія не актыўныя ў гэтым пытанні. Адсюль сама сабой вынікае задача большай сувязі пісьменнікаў з Чырвонай арміяй, з летнімі лагерамі, з баявой вучобай чырвонаармейцаў.

Заслугоўвае вялікай увагі аповесць тав. Самуйленка «Тэорыя Каленбрун», якая распрацоўвае пытанні класавай барацьбы ў арміі суседняй з намі дзяржавы, мабілізуючы ўвагу совецкага чытача на неабходнасці пільна сачыць за падрыхтоўчай работай да інтэрвенцыі, якая вядзецца фашыстамі ўсіх краін пад велюмам размоў аб раззбраенні, аб ненападзе і іншых пацыфісцкіх рэчах.

У апошнія гады значную ўдзельную вагу набыла тэматыка, якая трактуе пытанні нацыянальнай палітыкі, інтэрнацыянальнага выхавання. Яна часта сцэментуе сабою творы, якія маюць другія праблемы. Ад «Велікадушша» тав. Галаўчынера пра Парыжскую комуну да «Маці» Гурскага пра барацьбу нашай партыі за дыктатуру пролетарыята на Беларусі, пра барацьбу супроць нацыяналістаў усіх масцей і ў першую чаргу супроць беларускіх нацдэмаў, ад вершаў пра венскія падзеі, пра таварыша Дзімітрава, пра «Людзей з Альтоны» (Кавальскі) да «Наша бацькаўшчына СССР» тав. Броўкі і рамана «Бацькаўшчына» К. Чорнага, ад рэчаў, якія даюць малюнкі буйнейшых новабудоўляў СССР да паэм пра дарожнае будаўніцтва тав. Кляшторнага—усе гэтыя творы пранізаны баявым пролетарскім інтэрнацыяналізмам і вострапроціпастаўлены нацдэмакратыяму, які імкнуўся і імкнецца абмежаваць беларускую літаратуру ў нацыянальістычнай шкарлупе, адгарадзіць яе ад літаратур брацкіх саюзных рэспублік, атруціць чадам зоалагічнага нацыяналізма і шавінізма. У гэтым святле вельмі становчай з'яўляецца праблема распрацоўкі тэматыкі імперыялістычнай вайны 1914-1918 г. Над гэтай праблемай зараз працуе тав. З. Бядуля. Яе-ж распрацавалі тав. Лынькоў у рамане «На Чырвоных лядах» і т. Колас у п'есе «Вайна да пабеднага канца». Над гэтай тэматыкай працуе зараз рад пісьменнікаў у парадку падрыхтоўкі зборніка да 20-цігоддзя імперыялістычнай вайны. Правільны марксісцкі паказ падрыхтоўкі імперыялістычнай вайны, у тым ліку і метадаў распальвання нацыяналізма, шавінізма, павінен спрыяць прапагандзе інтэрнацыянальнага адзінства працоўных у барацьбе супроць новых імперыялістычных войн, супроць нападу на Совецкі Саюз—бацькаўшчыну пролетарыяў усяго свету.

Паказ класавага ворага, яго метадаў работы, яго ў

АПОШНІЯ ГАДЗІНЫ КАЛАМАНА ВАЛІША

ЖЭНЕВА, 20 красавіка. (Уласная інфармацыя «Правды»).

Аўстрыйскі рабочы, пядаўна вызвалены з турмы ў Леобене, прыслаў у рэдакцыю газеты «Травай» пісьмо, у якім ён апісвае апошнія гадзіны і пакаранне смерцю кіраўніка баёў у Штырыі Каламана Валіша.

«Акоуговая турма ў Леобене,— піша ён, — размешчана ў будынку быўшага манастыра. Яна разлічана на 100 зняволеных. У нядзелю 18 лютага нас знаходзілася там звыш 400 чалавек. У 4 гадзіны дня адзін крымінальны пастукаў у нашу камеру і шапнуў, што толькі што ў турму прывезлі Валіша разам з жонкай. На другі дзень у 2 гадзіны 20 мінут пачаўся ваенны суд.

Характэрны факт: у 7 гадзін вечара канцлер Дольфус асабіста пазваніў па тэлефону старшыні ваеннага суда Марынчу і патрабаваў у яго тлумачэнняў, чаму юстыцыя дзейнічае так марудна.

Тымчасам у турме паднялося вялікае хваляванне. Толькі асуджаны аставаўся спакойны. Па сканчэнню фармальнага тэрміна да яго з'явіліся старшыня і члены суда і аб'явілі, што прыгавор падлягае выкананню. Паўла разрыдалася. Турэмны доктар, каб палажыць канец, працягнуў Валішу насавую хустачку, прапітаную хлараформам, і Валішу самому прышлося ўсыпіць сваю падругу. Затым ён папрасіў, каб яму далі магчымасць развітацца хоць з некаторымі рабочымі. Да яго ўвялі трох зняволеных. Ён паціснуў ім рукі і сказаў:

— Аставайцеся заўсёды чэснымі пролетарыямі. Час нашай перамогі недалёк.

У 11 гадзін 30 мінут кат Шпіцэр і два памочнікі ўвайшлі ў камеру. Шпіцэр крыкнуў Валішу, які ветліва адмовіўся ад прапановы свяшчэнніка даць яму апошняе настаўленне:

— Ну, выходзьце адсюль.

— Вы вось, напэўна, можаце мяне пачакаць, — спакойна адказаў яму Валіш.

Два памочнікі ката ўзялі яго за рукі і павялі. За імі пашлі старшыня і члены суда і кат у чорным плашчы, цыліндры і белых пальчатках. Далей следаў натоўп цікавячыхся: афіцэры, жандармы, нейкія штацкія.

Вокны 8 пакояў, прыстасаваных пад камеры, выходзяць у ва двор. Гэта не маленькія турэмныя вокны, а звычайнага размеру, толькі з кратамі.

Мы змаглі наглядаць усю падрыхтоўку да кары. Крымінальныя вырылі яму для вісельні і прыбілі к ёй невялічкую драбінку для ката. Уладам прышлося прымусіць працаваць крымінальных таму, што ва ўсім горадзе не знайшлося плотніка, які-б згадзіўся прылажыць к гэтаму сваю руку.

Валіш ішоў, адкінуўшы назад галаву. Мы прывыклі бачыць яго такім на рабочых сходах, калі ён накіроўваўся да трыбуны. Яго паставілі спіной к слупу. Кат падняўся па драбінцы... Кат накінуў Валішу пятлю на шыю, абодва памочнікі ўхапіліся за яго плечы і пацягнулі тулава ўніз.

Апошні склад слова «свабода» непаспеў вырвацца з вуснаў Валіша. Праз некалькі секунд кат спусціўся ўніз, абнажыў галаву і сказаў:

— Прыгавор выканан.

У двары запанавала маўчанне. З акна адной камеры раптам пачуўся крык:

— Забойцы!

Праз дзве гадзіны цела нашага гераічнага правадыра было знята, паложана ў гроб і адвезена на могілкі.

ПАГРОЗА ЯПОНА-АМЕРЫКАНСКАЙ ВАЙНЫ

НЬЮ-ІОРК, 22 красавіка. (БЕЛТА). 10 відных амерыканскіх публіцыстаў і экспертаў па справах Далёкага Усхода выдалі кнігу «Імперыя на Усходзе».

Усе 10 аўтараў — члены «Амерыканскага савета інстытута ціхаакіянскіх адносін» — на аснове пагыблёнага гістарычнага і эканамічнага аналіза ўзаемаадносін ЗША, Японіі і Кітая аднадушна канстатуюць, што з акупацыяй Манчжурыі апетыты японскіх імперыялістаў узрастаюць і што агрэсіўныя імкненні Японіі накіраваны на манапольную эксплуатацыю Кітая, з чым ЗША не могуць мірыцца.

Аўтар заключнай главы прыходзіць да высновы, што пасля акупацыі Манчжурыі барацьба за панаванне ў Кітаі абвастраецца і павінна выліцца ў форму ваенных сутычак. Прадухіліць «вадаварот азіяцкіх войн» было-б, на думку аўтара, прасцей за ўсё шляхам адмаўлення ад барацьбы. З гэтай мэтай, — піша аўтар, — «дзяржавы павінны былі адмовіцца ад эканамічнага суперніцтва ў Кітаі, суперніцтва ў гандлі, прадстаўленняў пазык, капіталаўкладанняў у горную прамысловасць, у чыгуначнае і камунальнае будаўніцтва. Тэарытычна гэта магчыма. Але ў сапраўднасці дазволі толькі дапусціць такую пастаноўку пытання, каб перакананцца ў негрунтоўнасці падобнага дапушчэння.

Пры ўсім жаданні мы не можам паступіць такім чынам. Сілы, прымусіўшыя нас з'явіцца на Далёкім Усходзе, не даюць нам магчымасць выйсці адтуль.

Ніколі яны не дзейнічалі больш рашуча, чым цяпер, і гэта зараз яскрэй чым калі-небудзь».

Паказаўшы, такім чынам, няміну часць уцяжу ЗША ў вайне на Ціхім акіяне аўтары, аднак, пецяць сябе акадэмічнымі разважаннямі, што вайна можа быць прадухілена, калі ў капіталістычны лад увесці такія «сацыяльныя змены», як забарона вывазу капітала, забарона экспарта і т п.

НЬЮ-ІОРК, 21 красавіка. (БЕЛТА). «Балтымор сэн» у паведамленні з Вашынтона піша, што японская дэкларацыя аб палітыцы ў адносінах Кітая вымушае амерыканскія ўлады разгледзець пытанне аб тым, каб неадкладна прыступіць да грандыёзнага морскага будаўніцтва ў ЗША, згодна закону Вінсона (закон Вінсона дае паўнамоцтвы на будаўніцтва 101 ваеннага судна і 1.100 самалётаў морскай авіяцыі). Газета ўказвае, што Рузвельт вельмі неахвотна ідзе на ажыццяўленне праграмы морскага будаўніцтва ЗША, аднак, яго сакретнікі па замежных справах напамінаюць яму, што міжнароднае становішча пагоршваецца з кожным днём і ў любы момант можа стаць пагражаючым.

ПРЭЗІДЫУМ ВККІ ВІТАЕ „ЮМАНІТЭ"

Прэзідыум ВККІ горача вітае цэнтральны орган комуністычнай партыі Францыі «Юманітэ» у дзень яго 30-годдзя.

«Юманітэ», з'яўляючыся сапраўдным голасам працоўных мас, абаронцам іх інтарэсаў, сцяганосцам пролетарскага інтэрнацыяналізма і міжнароднай трыбунай комунізма, нястомна адукоўвае, згуртоўвае і арганізуе новыя калоны пролетарыята для рашучых класавых баёў.

Адзначаючы вялікае значэнне для сусветнага комуністычнага руху барацьбы «Юманітэ» супроць Версаля, у абарону працоўных мас Германіі, супроць вайны ў Мароко, супроць усіх антысовецкіх планаў, у абарону совецтаў у Кітаі, супроць фашызма ва Францыі і іншых краінах, — прэзідыум ВККІ выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што «Юманітэ», развіваючыся далей па шляху ўзорнай большэвіцкай газеты, будзе з кожным днём заваёўваць усё больш шырокія масы пад вялікі сцяг Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Францыі паскорыць перамогу адзінага пролетарскага фронта і тым самым падрыхтуе таржэства (совецтаў ва ўсім свеце.

Няхай жыве комуністычная партыя Францыі і яе цэнтральны орган «Юманітэ»!

Няхай жыве комунізм!

ПРЭЗІДЫУМ ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА.

ПРОЛЕТАРСКІ ПАРЫЖ ДЭМАНСТРУЕ СУПРОЦЬ ФАШЫЗМА

ПАРЫЖ. 21 красавіка. (БЕЛТА).

40 тыс. працоўных адгукнуліся на заклік компартыі і ўсеагульнай унітарнай канфедэрацыі працы і дэманстравалі ўчора ў Парыжы супроць надзвычайных дэкрэтаў і супроць фашызма.

Дэманстранты аказвалі супраціўленне нападаючай на іх паліцыі. У дэманстрацыях прымала ўдзел многа соцыялістычных рабочых, якія змагаліся разам з комуністамі пад лозунгам адзінага фронта. Газеты паведамляюць аб раненых, не ўказваючы іх ліку. Арыштаваны 940 дэманстрантаў.

1.200 чыгуначнікаў таварнай станцыі Ля-Шапель кінулі работу і правялі пад кіраўніцтвам унітарнага профсаюза мітынг пратэсту. Чыгуначнікі прагналі паліцыю, якая прабавала перашкодзіць правядзенню мітынга. Пасля мітынга чыгуначнікі далучыліся да дэманстрантаў. 400 чыгуначнікаў Ліёнскага вакзала кінулі работу і выйшлі на вуліцу на дапамогу дэманстрантам, на якіх напала паліцыя. 200 чыгуначнікаў вакзала Мон-Парнас таксама выйшлі на дэманстрацыю.

СТАЧКІ ПРАДАЎЖАЮЦЦА

КЛАСАВЫЯ БАІ Ў ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 21 красавіка. (БЕЛТА).

У сувязі з адбываючымся ў Мадрыдзе з'ездам моладзі каталіцкай аграрнай партыі, іспанская компартыя заклікала рабочых дэманстраваць супроць фашысцкіх правакацый і абявіць усеагульную стачку. Учора рабочыя, адгукнуўшыся на заклік компартыі, выйшлі на вуліцу і дэманстравалі супроць фашызма. Не гледзячы на паліцэйскія бар'еры, дэманстранты прарваліся к памяшканню каталіцкай аграрнай партыі. Паліцыя адкрыла стральніну. У сутычках паміж рабочымі і паліцыяй налічваецца некалькі забітых і раненых з абодвух бакоў. Многа арыштаў. У Більбао і Рансе пачалася ўсеагульная стачка.

Забастоўкі ў Сарагосе, Валенсіі і Мадрыдзе прадаўжаюцца.

ТЭЛЕГРАМА ГЕРОЯЎ СОВЕЦКАГА САЮЗА

МАСКВА т. т. СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ, ВАРАШЫЛАВУ, КУЙБЫШЭВУ, ЖДАНАВУ

МОЛНІЯ З УЭЛЕНА, 21 КРАСАВІКА (БЕЛТА).

Шчаслівы паведаміць, што труднейшы этап пераходкі выратаваных чэлюскінцаў з Ванкарэма ва Уэлен заканчваецца. Шлём у адказ гарадзе прывітанне правадыру партыі і совецкай краіны — т. **СТАЛІНУ**, т.т. **МОЛАТАВУ, ВАРАШЫЛАВУ, КУЙБЫШЭВУ, ЖДАНАВУ**, а таксама неперадаваемую падзяку за высокую ацэнку нашай работы.

Усім сэрцам рады, што выканаць задачу, апраўдаць вашы надзеі, давер'е партыі, усёй краіны нам удалося на самалётах, дзе ўсё да апошняга тросіка зроблена на родных совецкіх заводах, рукамі гераічнага пролетарыята вялікай краіны рэволюцыі, імя сыноў якой мы з гонарам нясем наперад і вышэй.

Дазвольце ў вашай асобе запэўніць партыю большэвікоў, яе ЦК, совецкі ўрад, што мы ўсё сваё жыццё да апошняй каплі аддамо вялікай і бліскучай справе мірнага будаўніцтва соцыялізма, і, калі трэба будзе, то і справе абароны радзімы ад любога ворага, які адважыцца сунуць сваё рыла ў совецкі агарод.

Няхай жыве слаўная наша большэвіцкая партыя, яе мудры штаб— Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве Совецкая краіна, яе ўрад, яе геніяльны рабочы клас і калгаснікі!

МОЛАКАЎ, КАМАНІН, ВАДАПЬЯНАЎ, ДАРОНІН, СЛЕПНЁЎ, ЛЯПІДЗЕЎСКІ, ЛЕВАНЕЎСКІ.

УСЕ ЧЭЛЮСКІНЦЫ ВЫВЕЗЕНЫ З ВАНКАРЭМА

ХАБАРАЎСК, 20 КРАСАВІКА. ЗГОДНА ВЕСТАК, АТРЫМАНЫХ СЁННЯ ДАЛЬКРАЙВЫКАНКОМАМ, З ВАНКАРЭМА ВЫВЕЗЕНЫ ЎСЕ ЧЭЛЮСКІНЦЫ. БОЛЬШАСЦЬ З ІХ УЖО ДАСТАЎЛЕНЫ ВА **УЭЛЕН** НА САМАЛЁТАХ. АСТАТНІЯ АДПРАЎЛЕНЫ НА НАРТАХ І ЯШЧЭ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ДАРОЗЕ. АДНА З ГРУП ЧЭЛЮСКІНЦАЎ ДАСТАЎЛЕНА Ў ПАСЁЛАК БУХТЫ **ЛАЎРЭНЦІЯ** І РАЗМЕШЧАНА Ў ПРАСТОРНЫХ ЕЎРАПЕЙСКАГА ТЫПУ ДАМАХ ЧУКОЦКАЙ КУЛЬТБАЗЫ.

ПАРАХОДАМ **«СМОЛЕНСК»** І **«СТАЛИНГРАД»** ДАРОГУ ПЕРАГАРАДЗІЛІ ІЛЬДЫ. «СТАЛИНГРАД» ЗНАХОДЗІЦЦА Ў 15 МІЛЯХ НА ПОЎНАЧ АД ВОСТРАВА МАТВЕЯ І РАСЧЫШЧАЕ САБЕ ДАРОГУ АМАНАЛАМ. «СМОЛЕНСК» ЗНАХОДЗІЦЦА КАЛЯ ВОСТРАВА ЛАЎРЭНЦІЯ І ПРАБУЕ ПРАБІЦЦА СКРОЗЬ ІЛЬДЫ.

„КРАСИН" У ЦІХІМ АКІЯНЕ

ЛЕДАКОЛ «КРАСИН», 21 красавіка (БЕЛТА). Тры дні ледакол стаяў у Калоне, прымаючы вугаль для пераходу ў Канаду. Амерыканскія ўлады аказалі камандзе совецкага судна цёплы прыём. 20 красавіка ў 2 гадзіны дня «Красин» прайшоў Панамскі канал і вышаў у Ціхі акіян.

ТАВ. О. Ю. ШМІДТ ВЫЯЗДЖАЕ У НЬЮ-ІОРК

НЬЮ-ІОРК, 20 красавіка (БЕЛТА). Як перадаюць з Нома (Аляска), доктар Шварц, прадстаўнік ведамства аховы здароўя ў Номе, паведаміў, што становішча здароўя **ШМІДТА** відавочна палепшылася.

НЬЮ-ІОРК, 21 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе «Асошыэйтэд прэс» з Нома, становішча здароўя тав. **ШМІДТА** значна палепшылася, і ён збіраецца 22-га красавіка выехаць у Нью-Іорк, а адтуль у Маскву.

АНТЫСОВЕЦКІЯ ЗАМЫСЛЫ ЯПОНСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ

ШАНХАЙ, 21 красавіка (БЕЛТА).

Паводле слоў «Івнінг пост» напярэдадні ад'езда Хуан Фу (старшыня палітычнага совета Паўночнага Кітая) з Бейпіна прадстаўнік японскіх улад паведаміў яго, што акупацыя Японіяй правінцыі Чахар і Суйюань, а таксама Бейпіна і Цяньцзіна, абсалютна неабходна для падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

З мэтай «выратаваць твар» нанкінская ўрада японскія ўлады гатовы ўступіць з ім у перагаворы аб намінальнай юрысдыкцыі Нанкіна ў Паўночным Кітаі. Калі Кітай адмовіцца ад перагавораў, Японія акупіруе Бейпінскі раён.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

— На дадатковых муніцыпальных выбарах у Ліллі кандыдат компартыі атрымаў 2.152 галасы—на 436 больш, чым на папярэдніх выбарах. А кандыдат соцыялістычнай партыі атрымаў на 647 галасоў менш, чым на папярэдніх выбарах.

— Румынія ліхаманкава рыхтуецца да вайны. Выпрацаван шырокі план узбраенняў. Ваеннае міністэрства патрэбавала не пашырыць 15-процантнага зніжэння ўсіх бюджэтных расходаў на ваенны бюджэт і вылучыць сумы ад эканоміі другіх міністэрстваў на закупку зброі. Урад згадзіўся.

— Іспанскі ўрад, не гледзячы на запэўненні аб «мірным» характары акупацыі Іфні (іспанская Сахара), перакідае туды войскі ўсіх радоў зброі. У Сеуце (крэпасць на афрыканскім узбярэжжы супроць Гібралтара) ужо высадзіліся экспедыцыйныя часці.

— Як паведамляюць, дням у бараках японскіх войск у Шанхаі, а таксама на вуліцах, заселеных японцамі, знойдзены комуністычныя лістоўкі і плакаты на японскай мове. Лістоўкі змяшчаюць лозунгі «Далоў японскі імперыялізм», «Спыніце ўтаржэнне ў Кітай», і заклікаюць японскіх салдат, студэнтаў і рабочых аб'яднацца ў непашамайскай дэманстрацыі. Лістоўкі падпісаны «шанхайскім рабочым камітэтам барацьбы супроць вайны».

— У міністэрства прапаганды ў Берліне на прыёме дыпкорпуса і замежных журналістаў начальнік штурмавых атрадаў Рэм катэгарычна заявіў, што Германія не згодна на роспуск штурмавых атрадаў, задачы якіх «выключна ўнутрыпалітычныя». Рэм указаў, што комуністычная небяспека ў Германіі яшчэ існуе, а таксама, што «скрытыя комуністы і марксісты» пранікаюць нават у нацыянал-соцыялістскія арганізацыі.

— Фінляндскі сойм аднагалосна зацвердзіў законы, узмацняючыя тэрор супроць рэволюцыйных рабочых. Урадавы друк указвае, што «дзякуючы благаразумю соцыял-дэмакратаў, у сойме стварыўся адзіны фронт супроць комунізма».

ТОКІО ЗАГАДВАЕ НАНКІНУ

БЕРЛІН, 21 красавіка (Ад уласн. кар. «Правды»).

Паводле паведамлення «Берлінер тагеблат» з Токіо, японскі ўрад у пачатку будучага тыдня патрэбуе ад Кітая поўнага спынення ўвозу зброі, а таксама адмаўлення ад скарыстання замежных інструктароў для рэарганізацыі кітайскай арміі.

РЭЗКІЯ ВОДГУКІ НА ЯПОНСКУЮ ДЭКЛАРАЦЫЮ АБ КІТАІ

АБУРЭННЕ У ЗША

ТОКІО, 21 красавіка. (БЕЛТА).

Нью-іоркскі карэспандэнт «Асахі» паведамляе, што з часу апублікавання заявы японскага міністэрства замежных спраў у японскае пасольства, генеральнае консульства і аддзяленні японскіх банкаў у ЗША паступае велізарная колькасць запытанняў, «чым растлумачыць апублікаванне заявы, якая гучыць правакацыяй па адрасу дзяржаў іменна ў той момант, калі япона-амерыканскія адносіны толькі-толькі пачалі паляпшацца».

Паводле слоў карэспандэнта, у нью-іоркскіх японскіх колах настойваюць, што міністэрства замежных спраў павінна пакончыць з «сістэмай апублікавання заяў ад імя прадстаўніка міністэрства і даручаць у будучым рабіць заявы пра тое, аб чым сур'ёзна думае Японія, больш адказнай асобе». Апрача таго, міністэрства павінна адмовіцца ад труслівай практыкі «выпуску пробных шароў».

ПРАТЭСТ КІТАЙСКАГА ПРАДСТАЎНІЦТВА У ЛОНДАНЕ

ЛОНДАН, 21 красавіка (БЕЛТА). Кітайскае дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Лондане апублікавала паведамленне.

«Японская дэкларацыя, — указваецца ў паведамленні, — выяўляе з большай чым калі-небудзь яснасцю планы Японіі ў адносінах Кітая і выдае яе каварныя намеры ўстанавіць кантроль над Кітаем на шкоду суверэнным правам кітайскай дзяржавы, а таксама прымусіць іншыя дзяржавы адмовіцца ад іх законнай зацікаўленасці ў прыродных багаццях Усходняй Азіі і ў неабмежаваным магчымасцях кітайскага рынку.

Гэта палітыка непасрэдна перашкоджае ўстанаўленню міру і парадку на Далёкім Усходзе. Кітайскі народ, які ўсведамляе свае правы і абавязкі незалежнай суверэннай дзяржавы, не намеран далучыцца да безгрунтоўнай дактрыны аб асаблівай місіі Японіі ў Азіі і думае, што другія дзяржавы таксама не пойдуць на гэта. Кітайскі ўрад ужо даў распараджэнне кітайскаму пасланніку ў Токіо зрабіць прадстаўленне па гэтаму пытанню і патрэбаваць адпаведных тлумачэнняў.

Лепшая гарантыя міру на Далёкім Усходзе, — заканчвае паведамленне, — не ў тым, каб спыніць прыязнае і пладатворнае супрацоўніцтва Кітая з заходнімі дзяржавамі, а ў тым, каб Японія адмовілася ад сваёй грубай імперыялістычнай палітыкі ў Азіі і абавязалася добрасумленна выконваць дагаворныя абавязацельствы».

„ПАЛІТЫКА АГРЭСІІ І ЭКСПАНСІІ"

ПАРЫЖ, 21 красавіка. (БЕЛТА). «Пці журналь» піша, што японская дэкларацыя накіравана не толькі супроць ЗША, але і супроць праектаў міжнароднага супрацоўніцтва ў Кітаі, распрацоўваемых Лігай нацый. Згодна вестак газеты, японскі консул у Жэневе і дэлегат на канферэнцыі па разазбраенню Іокаяма пацвердзіў, што такійская дэкларацыя мае на ўвазе жэнеўскія праекты міжнароднага супрацоўніцтва ў Кітаі.

Кітайская місія ў Парыжы апублікавала паведамленне, у якім гаворыцца: «Дэкларацыя такійскага ўрада, якая датычыць Кітая, ліпні раз выяўляе традыцыйную палітыку агрэсіі і экспансіі, якую вядзе Японія ў Азіі і, у прыватнасці, супроць Кітая. Такая палітыка супярэчыць інтарэсам міру».

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРАКУРАТУРЫ РЭСПУБЛІКІ

Не гледзячы на рад дырэктыў совецкіх і партыйных органаў аб прававым палажэнні настаўніцтва, па некаторых раёнах БССР правы настаўнікаў груба парушаюцца, не выплачваецца заработная плата па 2-3 месяцы, несвоечасова забяспечваюцца прадуктамі харчавання.

Пракуратурай рэспублікі супроць вінаватых у грубым парушэнні праў настаўніцтва праведзены судовыя працэсы па наступных раёнах:

ЧАШНІЦКІ РАЁН:

Па **Улукаўскаму** сельсовету за незабеспячэнне настаўнікаў прадуктамі, нявыплату зарплаты на працягу 3-4 месяцаў пры наяўнасці на бягучым рахунку грошай, за незабеспячэнне школ апалам, што прывяло да зрыву навучальнага года, асуджаны: старшыня сельсовета **Багданаў** — да 6 год пазбаўлення волі, сакратар сельсовета **Гуйтанна** — да 7 месяцаў прымусовых работ.

ПЕТРЫКАЎСКІ РАЁН:

За затрыманне выплаты зарплаты настаўнікам на працягу 4 месяцаў асуджан загалчык райфа **Ганусевіч** на 8 месяцаў прымусовых работ і старшыня сельсовета **Дубіна** — на 6 месяцаў прымусовых работ.

ТЕРАХОЎСКІ РАЁН:

За зрыў забеспячэння настаўнікаў асуджан старшыня сельсо **Кісялёў** на 6 месяцаў прымусовых работ.

ДЗЕРЖЫНСКІ РАЁН:

Пракуратурай рэспублікі, згодна сігналаў «Звязды», закончана расследваннем справы па абвінавачанню работнікаў Дзержынскага райсаюза, гарпо і 2 старшынь сельсоветаў у зрыве забеспячэння і нявыплаце зарплаты настаўнікам. Аддаюцца пад суд: загалчык райана **Спіцэвіч**, старшыня райсаюза **Ярашчук**, старшыня дзержынскага горсовета — былы райснаб — **Горфінкель**, намеснік старшыні дзержынскага гарпо **Каган**, старшыні Рубіжаўскага і Сталінскага сельсоветаў. Справа будзе разглядзана Вярхоўным судом БССР у бліжэйшы час.

Следчы тав. **Давыдзько**, які дысрэдытаваў сябе ў гэтым раёне, з працы знят.

Матэрыял на начальніка міліцыі тав. **Мілера** перадан у Галоўнае кіраўніцтва міліцыі для прыцягнення яго да дысцыплінарнай адказнасці за грубыя адносіны да настаўнікаў.

Терахоўскаму і **суражскаму** пракурорам прапаную ў пяцідзённы тэрмін правесці следства па выяўленню вінаватых з раённага кіраўніцтва (старшынь РВК) і прыцягнуць да крымінальнай адказнасці за сістэматычнае затрыманне выплаты зарплаты.

Астатніх пракураў раёнаў і гарадоў абавязваю праверыць выкананне тэлеграмы старшыні Соўнаркома БССР тав. **Галадзеда ад 14 красавіка 1934 года**, у якой катэгарычна прапанавана пад адказнасць старшынь РВК на працягу пяці дзён ліквідаваць усю запазычанасць па зарплаце і забяспечыць у далейшым своечасовую выплату зарплаты і выдачу прадуктаў харчавання.

У сувязі з набліжэннем летняга адпачынку прапаную прасачыць за своечасовай выплатай зарплаты настаўнікам усіх школ за час летняга адпачынку.

Пракурор рэспублікі КУЗЬМІН.

АБ ПАРТЫЙНА-КОМСАМОЛЬСКІХ НАРАДАХ ПА ПЕРШАМАЙСКАМУ АГЛЯДУ РАБОЧЫХ КВАТЭР

Пастанова бюро Менгаркома КП(б)Б

Склікаць сёння па ўсіх жактах і домакіраўніцтвах нараду комуністаў і комсамольцаў-жыхароў па пытанню агляду падрыхтоўкі вуліц, двароў і рабочых кватэр да 1-га мая.

Яўка ўсіх комуністаў і комсамольцаў-жыхароў на гэты сход абавязкова ў парадку партыйнай і комсамольскай дысцыпліны.

Адказнасць за арганізацыю сходаў ускласці на партгрупы праўленняў жактаў. Сходы праводзяцца прадстаўнікамі ГК КП(б)Б.

Прыняць да ведама паведамленні ЦП профсаюза гарбароў аб выдзяленні ім 5 патэфонаў для прэміравання за лепшую падрыхтоўку рабочай кватэры да 1 мая.

Паставіць пытанне перад усімі ЦП саюзаў аб іх актыўным удзеле ў аглядзе.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

Менскі ГК КП(б)Б даводзіць да ведама партыйнага і профсаюзнага актыва, што 24 красавіка 1934 года ў 7 гадз. вечара ў памяшканні Дома партактыва, у вялікай зале адбудзецца працяг лекцыі тав. Пассэ па нацпытанню.

Уваход па разасланых білетах.

Кіно „ПРОЛЕТАРЫЙ".

З 21 красавіка

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

2 БУЛЬДЗІ 2

(Зусім новы экземпляр).

Дзейнічаючыя асобы:

Дырэктар цырка—В ЦОННІ.
Наездніца Маня—А. СУДАКЕВІЧ.
Клоун —С. КАМАРОЎ.
Палкоўнік —А. ФАЙТ.
Бульдзі —В. КОЧАТАЎ.

ПАЧАТАК 1 сеанса ў 6 гадзін.

Каса з 4 гадз.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

25 і 26 красавіка

толькі 2 КАНЦЭРТЫ

КВАРТЭТА ГЛАЗУНОВА.

Білеты ў рабочай касе з 12 да 2 гадз. і з 4 да 6 гадзін. Падрабязнасці ў афішах.

ГАРСНАБ

і Бюро наборных дакументаў

АБ'ЯЎЛЯЮЦЬ, ШТО ВЫДАЧА

НАБОРНЫХ ДАКУМЕНТАЎ НА МАЙ МЕСЯЦ

будзе вытварацца 25, 26, 27 і 28-га красавіка з 9 гадзін раніцы да 7-мі гадзін вечара ў наступным парадку:

25-га павінны з'явіцца тыя, каму было назначана 20 і 21
26-га „ „ „ „ „ „ 22, 23 і 24
27-га „ „ „ „ „ „ 25, 26 і 27
28-га „ „ „ „ „ „ 28 і 29

Улаўнаважаныя пры атрымані наборных дакументаў павінны прадставіць акрамя заявак (тым, якія раней заявак не праставілі) яшчэ і раздатачныя ведамасці і табеля за красавік месяц.

Гарснаб САФ'ЯН.

Бюро наборных дакументаў

Кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРНА". Гукавы мастацкі фільм „ГРОЗА" па твору Астроўскага

Дзіцячы кіно-тэатр. Маст. фільм у 3 х серыях ЧЫРВОНАЯ Д'ЯБАЛЯТА. У праграме—гукавая хроніка. Пачатак дзен. сеансаў у 3 г.

Кіно Інтэрнацыянал. Новы мастацкі фільм Каралеўскія матросы

Кіно „СПАРТАК". 2 ПРАГРАМЫ ў 1 сеанс. 1) Доктар Джэк кам. у 6 ч. 2) Труп Дэ-Юрэ кам. у 5 ч.

ГАТАВАЛЬНЮ вялікага разме ру (105х270 мм. з 12-ці прадме таў, лінейку лагарыфмічную, алоўкі і іншыя чарцёжныя прылады (27 прадметаў) поштай высылае па атрымаццю 80 рублёў.

Універмаг культтавараў „Ленпромторга",

(Ленинград, ул. 3-го Июля, Гостиный Двор, пом. 67 69).

У гэту цану ўключаны і выдаткі на тару, упаноўку і перасылку.

Патрабуйце падрабязныя праспекты.

ДА ЎВАГІ ЎСІХ

дзяржаўных, кааперацыйных, прафсаюзных і інш. арганізацый

Аддзел турысцкай гаспадаркі ЦС ОПТЭ аб'яўляе: што на аснове пастановы Прэзідыума ЦС ОПТЭ, правам запісу (груп. калектыўў, адзіночак-турыстаў) на саюзныя маршруты ЦС ОПТЭ карыстаюцца толькі тыя рэспубліканскія, крайёвыя і абласныя арганізацыі ОПТЭ, якім ОТХ выдаў спецыяльныя даверанасці на права запісу.

Заключэнне дагавораў з мясцовымі арганізацыямі ОПТЭ, якія не маюць даверанасці ОТХ ЦС, будуць лічыцца несапраўднымі і ОТХ за іх адказнасці не нясе.

УСЕ заключаныя раней дагаворы з мясцовымі арганізацыямі ОПТЭ павінны быць неадкладна перазаключаны, на аснове выданага даручэння ОТХ ЦС ОПТЭ.

ОТХ ЦС ОПТЭ.

Васілевіцкая лесашкола „ЛПВ" трэста Лесбел

абвешчае ВЕСНАВЫ НАБОР

у 100 чал. па спецыяльнасці лесазкспляатацыі шыбрэлістых парод. Тэрмін навучання—6 месяцаў. Прыём з асветай 5—7 груп сямігодкі. У асобных выпадках дапускаюцца з асветай 4 груп. Узрост—не ніжэй 17—21 г. Прынятым забяспечваюцца стыпендыяй ад 45 да 75 руб. у месяц. Снабжэнне па 1-му спісу 1-й катэгорыі. Пры школе ёсць сталоўка, інтэрнаты, пральня і бясплатная лазня. Заявы прымаюцца да 25 красавіка г.г. Пачатак заняткаў 3 мая 1934 г. Да заявы неабходна прыкласці засведчаную анкету, даведку аб соцстановішчы бацькоў, метрыку, аб асвеце і паштовы марак на 40 кап.

Школа знаходзіцца побач з станцыяй чыгункі.

Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: ст. Васілевічы Заходн. чыгункі, лесашколе.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Згодна пастановы СНК БССР, НКЗБ і кіраўніка АБВ, БЕЛАРУСКІ ТРЭСТ ПА БАРАЦЬБЕ СА ШКОДНІКАМІ сельскай і лесной гаспадаркі „АБШ", а таксама машынна-зкшчальныя станцыі (МЗС), уваходзячыя ў яго сістэму, у нізэйшаказаных гарадах: Орша, Бабруйск, Віцебск, Гомель, Магілёў і Менск—

ЛІКВІДУЮЦЦА.

Усе установы, арганізацыі і прыватныя асобы, маючыя прэтэнзіі к Беларускаму трэсту „АБШ", а таксама к вышэйпаказаным „МЗС", павінны прадаўвіць іх ліквідацыям зпошніх да 5-га мая 1934 г. на месцы іх знаходжання.

Пасля ўказанага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца НЕ БУДУЦЬ

Адрас: Менск, Пляц Волі, № 4.

ЛІКВІДАТАР.

Школьнае кіраўніцтва Наркамасветы і дырэкцыя менскага педінстытута паведамляюць

СТУДЭНТАЎ З КУРСА літаратурнага аддзялення

якія зараз знаходзяцца на практыцы ў школах, што яны

павінны вярнуцца на вучобу ў інстытут да 1-га мая.

3-га мая пачынаюцца заняткі.

Загалчыкам устаноў, у якіх працуюць гэтыя студэнты, прапануецца зрабіць разлік з імі і адкамандзіраваць іх у інстытут.

Начальнік кіраўн. масавай школы Лешчынскі.

Дырэктар Інстытута Вожкаў.

ЦЭНТРАЛЬНЫ БАТАНІЧНЫ САД Беларускай акадэміі навук (Менск, Барысаўскі тракт)

адпускае для азеляняльных пасадак

САЖАНЦЫ ДРЭЎ І КУСТОЎ

(акацыя, спірэі, ілён, ясень, дуб, ту і інш.) з аранжарэйных прадаюцца бегоніі ў горшках.

Зварачацца ў кантору з 9 да 3 з пал. гадз. дня. Тут-жа праводзіцца набор рабочых на пазаённую, месячную, сезонную і сталую работы.

СЕКТАР КНІГАГАНДЛЮ ДВБ

просіць усіх былых рабочых і служачых да 28-га красавіка г.г. свае

атрымаць аблігацыі пазык „3 рашаючы" і „4 завяршаючы год пяцігодкі".

Не атрыманыя да паказанага тэрміна аблігацыі будуць зданы ў вышчадкасу ў абязлічаным выглядзе.

Гомельскай цэнтральнай лазні

ПАТРЭБЕН ВАДАГРЭЙНЫ КАЦЁЛ,

паверхней нагрэва 100-150 кв. м.

Адрас: Гомель, Пролетарская, 8.

Беларуская кантора Дзяржбанка

за пратэрміноўку пазык

абвяшчае ПРОДАЖ

наступных тавараў, належачых

скарняжнай фабрыцы імя 1 Мая:

Футровыя каўняры
„ шапкі
Паўшубкі і інш.

Усяго на агульную суму 400.000 р.

За даведкамі зварачацца ў таварны аддзел Дзяржбанка.

МЕНЯЮ 2 пакоі ў цэнтры ў разных раёнах, з асобн. ходамі з удобст. на адзін вялікі абодва меншых рэзам. Прапановы ў пісьмовай форме—пошта, да патрабавання, ОЛЕШКЕВІЧУ Е.

Рэдакцыя газеты «ЗВЯЗДА», прэзідыум БЕЛКААПСАЮЗА і ЦП саюза работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю

склікаюць СЁННЯ, 23 красавіка,

КАНФЕРЭНЦЫЮ

спажыўцоў-пайшчыкаў і работнікаў прылаўка

па пытанню якасці тавараў, асартыменту і барацьбы з бракам.

Канферэнцыя адбудзецца ў клубе работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю (рог Энгельса і Комуністычнай вуліц).

Пачатак роўна ў 7 з палов. гадзін вечара.

Менск, друкарня «Звязды».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Упаўн. Галоўлітбела № К—2596.